ЕЎРАПЕЙСКІ ГУМАНІТАРНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Акадэмічны дэпартамент гісторыі

Праграма бакалаўра гісторыі
Беларусістыка: Ахова і выкарыстанне культурнай спадчыны

**СЕРЫКАВА ВОЛЬГА**
Студэнтка IV курса

# БРАТЫ ЛУЦКЕВІЧЫ ЯК СТВАРАЛЬНІКІ І ЗАХАВАЛЬНІКІ БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ Ў ВІЛЬНІ (1921-1945)

БАКАЛАЎРСКАЯ ПРАЦА

Кіраўнік працы: доктар гіст. навук, праф. Смалянчук А.Ф.

Вільнюс, 2009

pawet.net

**Серыкава, Вольга**

Браты Луцкевічы як стваральнікі і захавальнікі Беларускага музея ў Вільні (1921-1945) : бакалаўрская праца / Вольга Серыкава; навуковы кіраўнік доктар гіст. навук, дацэнт А. Ф. Смалянчук ; Еўрапейскі гуманітарны універсітэт. Акадэмічны дэпартамент гісторыі. – Вільнюс, 2009. – 61, [2] л. : Библиогр.: с. 59–61 (51 наз.).
UDK

***Ключавыя словы:*** *Беларускае нацыянальнае Адраджэнне пачатку XX ст., Віленскі беларускі музея імя І. Лукцевіча, Іван Луцкевіч, Антон Луцкевіч, Беларускае Навуковае Таварыства, музейная справа Беларусі.*

*Аб’ект бакалаўрскай працы* - развіццё і лёс беларускай культуры ў Вільні. *Мэта даследавання* – ахарактарызаваць ролю кожнага з братоў у стварэнні і развіцці Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў кантэксце іх дзейнасці на ніве беларускага Адраджэння. *Задачы даследавання*: ахарактарызаваць дзейнасць братоў Луцкевічаў па развіццю беларускай культуры і ролю кожнага з іх у стварэнні і дзейнасці Віленскага беларускага музея; зрабіць аналітычнае апісанне фондаў Віленскага беларускага музея; апісаць лёс музейнай калекцыі пасля арышту Антона Луцкевіча.

Выкарыстоўваючы такія *метады* даследавання як гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны і гісторыка-сістэмны, былі зроблены вывады, што музейная дзейнасць братоў Луцкевічаў мела вялікае значэнне не толькі для Адраджэння Беларусі ўвогуле, але і для развіцця музейнай справы на Беларусі, і менавіта Антон Луцкевіч стварыў музей як навуковую і ўпарадкаваную ўстанову. Культурніцкай дзейнасці братоў Луцкевічаў, дзейнасці музея і яго лёсу пасля арышту А. Луцкевіча прысвечаны шэраг энцыклапедычных, навуковых і публіцыстычных даследаванняў беларускіх гісторыкаў і навукоўцаў. У беларускай гістарыяграфіі даследаванымі з’яўляюцца палітычная і грамадская дзейнасць братоў Луцкевічаў, у тым ліку ў галіне беларускага школьніцтва і выдавецтва беларускіх газет, дзейнасць І. Луцкевіча па збіранню музейнай калекцыі, літаратурная дзейнасць А. Луцкевіча. Даследаваны ў некаторай ступені і найбольш каштоўныя з пункту гледжання шэрагу даследчыкаў экспанаты Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча. Крыніцы па жыццю і культурніцкай дзейнасці братоў Івана і Антона Луцкевічаў носяць у асноўным характар успамінаў. Не ўсе з існуючых крыніц належным чынам прааналізаваныя. Пра Антона Луцкевіча ў апошняе дзесяцігоддзе з’явілася шмат даследаванняў. На сенняшні дзень вельмі грунтоўна

даследавана літаратурная, выдавецкая і палітычная дзейнасць Антона Луцкевіча. Гэта ў асноўным даследаванні А. Сідарэвіча. Але асоба славутага беларуса яшчэ не атрымала належнай ацэнкі гісторыкаў. У прыватнасці, даследаванне існавання і дзейнасці Віленскага беларускага музея ў асноўным звязана з іменем Івана Луцкевіча, пры гэтым не даследавана роля малодшага брата Антона ў стварэнні музейнай калекцыі і гісторыі музея і яго ролі ў развіцці беларускай культуры. Існуюць толькі некалькі даследаванняў калекцый Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча, гэта артыкул А. Луцкевіча “Беларускі музей імя Івана Луцкевіча”, надрукаваны ў Гадавіку Беларускага Навуковага Таварыства ў 1933 годзе і кніга “Архіў беларускага Адраджэння” Ю. Лабынцава. Адсутнічаюць грунтоўныя даследаванні па прадметах, якія захоўваліся ў музеі і ўяўлялі вялікую культурную каштоўнасць.

Бакалаўрская праца *можа быць карысна* вучоным-гісторыкам, выкладчыкам гістарычных дысцыплінаў, спецыялістам у галіне вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны, музеязнаўцам і студэнтам.

pawet.net

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ ........................................................ 4

1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ ........................................................ 8
1.1. Гістарыяграфія ........................................................ 8
1.2. Крыніцы ........................................................ 14

2. БРАТЫ ЛУЦКЕВІЧЫ І БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У XX СТ. ........................................................ 18
2.1. Маладыя гады. Пачаткі беларускага руху ........................................................ 18
2.2. Дзейнасць у перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг. і нацыянальна-культурнага Адраджэння ...... 22
2.3. Збіральніцкая праца і стварэнне музейнай калекцыі ........................................................ 26
2.4. Дзейнасць А. Луцкевіча ў міжваенны час. Стварэнне музея ........................................................ 31

3. ФОНДЫ БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ ........................................................ 40
3.1. Калекцыі Беларускага музея ........................................................ 40
   3.1.1. Археалогія ........................................................ 41
   3.1.2. Нумізматыка ........................................................ 42
   3.1.3. Мастацтва ........................................................ 42
   3.1.4. Этнаграфія ........................................................ 43
   3.1.5. Зброя і рыштунак ........................................................ 44
   3.1.6. Бібліятэка ........................................................ 44
3.2. Лёс музейнай калекцыі пасля арышту А. Луцкевіча ........................................................ 51

ЗАКЛЮЧЭННЕ ........................................................ 56

СПІС ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ ........................................................ 59

ДАДАТКІ
Дадатак 1. Браты Луцкевічы ........................................................ 91
Дадатак 2. Інвентарная кніга Музею ім. Івана Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні (Вільня, 2.VI. 1922 г., А. Луцкевіч) ........................................................ 62
Дадатак 3. Архівы Беларускага музею ў Вільні, забраныя НКВД пры ЛССР 15/16 VIII 1944 г.. 91

Lutskevich brothers as founders and keepers of Belarusian museum in Vilnius (1921-1945) (summary) ........................................................ 95

# УВОДЗІНЫ

Пачатак XX стагоддзя ў Вільні характарызуецца гісторыкамі і даследчыкамі як эпоха беларускага Адраджэння, якое праяўлялася як у палітычнай, так і ў культурнай сферы. У гэты час у Вільні пачалі ствараца і дзейнічаць беларускія палітычныя, грамадскія і культурныя ўстановы. У сувязі з гэтым у беларускай гісторыі з’явілася шмат новых імёнаў дзеячаў беларускага адраджэнскага руху.

Браты Іван і Антон Луцкевічы з’яўляюцца пачынальнікамі працы на ніве Адраджэння і знакавымі асобамі ў беларускім нацыянальным руху. Менавіта іх можна назваць бацькамі беларускай дзяржаўнасці. Створаны імі разам з іншымі дзеячамі ў Вільні беларускі асяродак вакол газеты "Наша Ніва" стаў сэрцам усяго беларускага адраджэнскага руху. Але імёны братоў Луцкевічаў і іх велічэзная роля ў закладанні падмуркаў сучаснай беларускай нацыі многія дзесяцігоддзі замоўчвалася савецкай прапагандай.

Тэма даследавання ролі братоў Луцкевічаў у стварэнні і захаванні Беларускага музея ў Вільні з’яўляецца актуальнай, бо звычайна Беларускі Музей звязваецца з іменем Івана Луцкевіча, аднак на самой справе роля Антона Луцкевіча не менш важная. Менавіта ён стварыў музей і быў захавальнікам яго фондаў. Беларускі музей ў Вільні адыгрываў вялікае значэнне ў кантэксце беларускага нацыянальнага Адраджэння ў пачатку XX ст., і гэтае значэнне не раскрыта і па сённяшні дзень. Гэта ставіць пытанне ўсебаковага вывучэння гісторыі музея, жыцця і дзейнасці яго стваральнікаў і захавальнікаў - братоў Луцкевічаў. Аналіз навуковай літаратуры пра братоў Луцкевічаў дае падставу сцвярджаць, што яе колькасць з кожным годам павялічваецца, але грунтоўнага, манаграфічнага даследавання пра дзейнасць адраджэнцаў і пра гісторыю Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча яшчэ не з’явілася.

Мэта даследавання – ахарактарызаваць ролю кожнага з братоў у стварэнні і развіцці Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў кантэксце іх дзейнасці на ніве беларускага Адраджэння.

Задачы даследавання:

1. Ахарактарызаваць дзейнасць братоў Луцкевічаў па развіццю беларускай культуры і ролю кожнага з іх у стварэнні і дзейнасці Віленскага беларускага музея;
2. Зрабіць аналітычнае апісанне фондаў Віленскага беларускага музея;
3. Апісаць лёс музейнай калекцыі пасля арышту Антона Луцкевіча.

Аб’ектам даследавання з’яўляецца развіццё і лёс беларускай культуры ў Вільні.

Прадмет даследавання – роля Івана і Антона Луцкевічаў ў стварэнні Беларускага музея і захаванні яго фондаў.

Асноўнымі метадамі даследавання з’яўляюцца гісторыка-генетычны, накіраваны на аналіз дынамікі гістарычных працэсаў і выяўленне прычынна-следчых сувязяў; гісторыка-параўнальны метад, якія дазваляе супаставіць розныя перыяды гісторыі музея; гісторыка-сістэмны метад. Апошні выяўляе функцыянальныя сувязі гістарычных падзей і з’яваў.

Для даследавання ролі братоў Луцкевічаў у стварэнні і захаванні Беларускага музея ў Вільні былі выкарастаны наступныя літаратурныя крыніцы: ўспаміны тых, хто мае непасрэднае дачыненне да жыцця і дзейнасці І. і А. Луцкевічаў і працы музея. Гэта ўспаміны А. Луцкевіча, Ю. Вітан-Дубейкаўскай, А. Будзькі, Я. Шутовіча, М. Пецюкевіча, Я. Багдановіча. Таксама звесткі пра дзейнасць музея публікаваліся ў Гадавіку Беларускага Навуковага Таварыства, Запісах Беларускага Навуковага Таварыства, у газеце “Голас Беларуса” ў раздзеле “Хроніка Заходняй Беларусі”, газеце “Беларуская Ніва”. У якасці крыніцы па біяграфіі І. Луцкевіча быў разгледжаны зборнік “Памяці І. Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго”. Былі выкарастаны энцыклапедычныя выданні “Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 тамах”, падручнікі “Нарыс гісторыі Беларусі” З. В. Шыбекі, хрэстаматыя “Гісторыя Беларусі канца 18 – пачатку 20 ст. у дакументах і матэрыялах”, “Найноўшая гісторыя Беларусі” Я. Міրановіча, матэрыялы канферэнцый у зборніку “Вяртанне”, даследаванні А.Сідарэвіча па жыццю і творчасці А. і І. Луцкевічаў. У часопісе “Спадчына” надрукавана поўная “Інвентарная кніга Музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні”. Былі выкарыстаны артыкулы пра дзейнасць братоў Луцкевічаў і Віленскі беларусі музей А.А. Гужалоўскага, А. Сідарэвіча, Л. Крывіцкага, В. Лабачэўскай, У. Ляхоўскага, матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі па сумеснаму выкарыстанню і вяртанню архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах. Шмат для папулярызацыі гісторыі музея і яго стваральнікаў зрабіў У. Арлоў. Для даследавання былі выкарыстаны яго публікацыі: “Дзесяць вякоў беларускай гісторыі”, якая была напісана сумесна з Г. Сагановічам, і “Краіна Беларусь: ілюстраваная гісторыя”. Трэба адзначыць, што гэтыя творы носяць у асноўным публіцыстычны характар.

Першая глава бакалаўрскай працы прысвечаная аналізу гістарыяграфіі і крыніц пра культурніцкую дзейнасць братоў Луцкевічаў, дзейнасць музея і яго лёс пасля арышту А. Луцкевіча.

Другая глава бакалаўрскай працы раскрывае дзейнасць братоў Луцкевічаў у развіцці беларускай культуры, а таксама ролю кожнага з іх у стварэнні і захаванні Беларускага музея.

У трэцяй главе аналізуюцца фонды музея і даследуецца лёс музейнай калекцыі пасля арышту А. Луцкевіча.

У заключэнні падводзяцца вынікі даследавання.

У дадатках прыведзены спіс прадметаў па калекцыях з Інвентарнай кнігі Музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні; спіс архіваў Беларускага музею ў Вільні, што былі забраны НКВД пры ЛССР у 1944 годзе; матэрыялы Віленскага беларускага фонду № 21 у бібліятэцы Літоўскай акадэміі навук; спіс рэчаў з Віленскага беларускага музея, якія экспанаваліся на выставе “Спадчына, якая належыць Беларусі” ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі і якія зараз захоўваюцца ў навуковых і музейных установах горада Менска.

# 1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ

## 1.1. Гістарыяграфія

Культурніцкай дзейнасці братоў Луцкевічаў, дзейнасці музея і яго лёсу пасля арышту А. Луцкевіча прысвечаны шэраг навуковых і публіцыстычных даследаванняў беларускіх гісторыкаў і навукоўцаў.

Найбольш грунтоўнымі даследаваннямі, якія цалкам прысвечаныя гісторыі музея, жыццю і дзейнасці братоў Луцкевічаў, з'яўляюцца: публікацыі А. Луцкевіча (артыкул "Беларускі музей імя Івана Луцкевіча" ў Гадавіку Беларускага Навуковага Таварыства [25, с. 3-16], кніга "За дваццаць пяць гадоў (1903-1928)"), артыкул А. Гужалоўскага "Сабранае застаецца, калі свой не адхінецца", артыкулы А. Сідарэвіча "Збіральнік і публікатар. Да 120-х угодкаў Антона Луцкевіча" [37, с. 114-119], "А. Луцкевіч" [35, с. 92-161], "З жыцця А. Луцкевіча", "Чалавек, які спаліў сябе" [33, с. 3-10], кніга А. Сідарэвіча "А. Луцкевіч. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва", артыкулы пра Івана і Антона Луцкевічаў у Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, артыкул "Нельга абысці маўчаннем" Л. Крывіцкага [22, с. 10-17], артыкул Я. Адамовіча "Як дух змагання Беларусі (да 100х угодкаў нараджэння І. Луцкевіча)" [1, с. 5-27], артыкул А. Каўкі "Іван Луцкевіч - Адраджэнец" [21, с. 41-51], артыкул А. Смалянчука "Краёвец Антон Луцкевіч" [39, с. 27-52].

Артыкул А. Луцкевіча "Беларускі музей імя Івана Луцкевіча" быў надрукаваны ў Гадавіку Беларускага Навуковага Таварыства (Вільня, 1933). У склад Таварыства ўваходзілі браты Луцкевічы. У гэтым тэксце А. Луцкевіч распавядае пра заснаванне Беларускага музея ў Вільні, пра кіраўніцтва музеем ў пачатку 30-х гадоў XX ст. і апісвае яго аддзелы, калекцыі і стан іх распрацавання. Можна адзначыць, што тэкст А. Луцкевіча носіць эмацыянальную афарбоўку і мае характар успамінаў. Пішучы пра І. Луцкевіча і пра гісторыю беларускага руху, А. Луцкевіч пакладаўся толькі на сваю памяць. Яго даследаванне з'яўляецца каштоўным для гісторыкаў, так як ён з'яўляўся непасрэдным сведкам жыцця і дзейнасці свайго брата, І. Луцкевіча, і працы музея ад яго заснавання да арышта А. Луцкевіча ў 1939 годзе. Таксама А. Луцкевіч адзначае прычыну тагачаснай павольнасці музейнай працы, якая заключалася ў нястачы матэрыяльных сродкаў і цеснаце памяшкання для экспанавання прадметаў калекцыі. Калекцыя музея, сабраная І. Луцкевічам, была значных памераў, таму для яе апісання А. Луцкевіч вылучае найбольш каштоўныя з яго пункту гледжання прадметы, якія маюць найбольшае значэнне для вывучэння гісторыі Беларусі.

Акрамя гэтага артыкула А. Луцкевіча ў Гадавіку знаходзяцца звесткі пра дзейнасць Таварыства ў галіне беларускага школьніцтва, пра сяброў таварыства, пра дзейнасць Віленскага Беларускага музея і ўтварэнне ў ім сталага кіраўнічага органа, пра супрацоўніцтва І. Луцкевіча з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, у першую чаргу, немцамі ў перыяд нямецкай акупацыі Вільні з мэтай пашырэння ведаў пра гісторыю, мастацтва, культуру і этнаграфію Беларусі сярод немцаў. Гадавік не захоўвае інфармацыю пра поўную дзейнасць Беларускага Навуковага Таварыства ў цэлым і братоў Луцкевічаў у прыватнасці, бо няма запісаў усіх пратаколаў паседжанняў Рады таварыства: назіраюцца перапынкі ў дзейнасці з 13 мая 1918 г. да 1923 г., з 1927 да 1928 г. З 1919 году захаваліся толькі чарнавыя заметкі аб двух паседжаннях. З пратаколаў Таварыства відаць, што галоўнай задачай яго дзейнасці пасля стварэння музея імя І. Луцкевіча было ўпарадкаванне музея і бібліятэкі Таварыства і абарона іх ад эксмісіі.

У Гадавіку Навуковага Таварыства змяшчаюцца і апісанні некаторых прадметаў, дакументаў, якія знаходзіліся ў той час у калекцыі і архівах Віленскага Беларускага музея і якія маюць вялікае значэнне для вывучэння гісторыі і мастацтва Беларусі.

Захаваліся Запісы Беларускага Навуковага Таварыства (Вільня, 1938), у якіх змяшчаецца кароткая інфармацыя пра музейную секцыю таварыства: выставы, у якіх удзельнічаў музей, колькасць наведвальнікаў з 1933 па 1938 гады.

У кнізе “За дваццаць пяць гадоў (1903-1928)” (Вільня, 1928) А. Луцкевіч апісвае арганізаваны беларускі палітычны рух у пачатку XIX ст., а менавіта дзейнасць Беларускай сацыялістычнай Грамады. Акрамя гэтага, кніга з’яўляецца крыніцаў біяграфіі братоў Луцкевічаў. А. Луцкевіч з’яўляўся непасрэдным сведкам апісаных у кнізе падзей, якія адбываліся на палітычнай арэне ў той час. Інфармацыя пададзеная ў кнізе аснована толькі на памяці А. Луцкевіча. Кніга носіць характар успамінаў.

У артыкуле А. Гужалоўскага “Сабранае застаецца, калі свой не адхінецца”, змешчанага ў часопісе “Мастацтва Беларусі” (Менск, 1991), аўтар прыводзіць у якасці прыклада дзейнасці беларускага нацыянальна-культурнага руху на “ўсходніх крэсах” Беларускі музей імя І. Луцкевіча і коратка апісвае біяграфію І. Луцкевіча і калекцыі музея. Пры гэтым дзейнасць музея А. Гужалоўскі разглядае ў рамках развіцця музейнай справы Беларусі, што мае вялікае значэнне для гісторыі культуры Беларусі.

А. Сідарэвіч прысвяціў даследаванню жыцця і дзейнасці А. Луцкевіча шматлікія артыкулы ў часопісах і газетах і выдаў кнігу “А. Луцкевіч. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва” (Менск, 2006). Артыкул “Збіральнік і публікатар” у часопісе “Куфэрак Віленшчыны” за 2004 год распавядае пра збіральніцтва А. Луцкевічам рукапісаў, якія пасля ўваходзілі ў фонд Віленскага беларускага музея, і пра іх публікацыю дзеля знаёмства з імі

іншых людзей. Артыкул “А. Луцкевіч” у часопісе “Нёман” за 1990 год змяшчае поўную біяграфію А. Луцкевіча. Найбольш увагі А. Сідарэвіч надае яго палітычнай дзейнасці. У артыкуле “З жыцця А. Луцкевіча” ў газеце “Літаратура і мастацтва” за 1991 г. аўтар апісвае рукапісы А. Луцкевіча. У кнігу “А. Луцкевіч. Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва” А. Сідарэвіч уключыў беларускамоўныя артыкулы, лекцыі, рэцэнзіі, нататкі, біяграмы, некралогі А. Луцкевіча, прысвечаныя праблемам культуры, літаратуры і мастацтва. Гэтая кніга з'яўляецца найбольш поўным зборам літаратурнай спадчыны А. Луцкевіча.

А. Сідарэвіч у 2007 годзе здзейсніў перавыданне тэкстаў брашуры “Памяці І. Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго” (Менск, 2007) са сваімі прадмовай і каментарамі. Івана Луцкевіча А. Сідарэвіч называе “Чалавекам, які спаліў сябе”, што ідаць па загалоўку прадмовы да брашуры. Увогуле А. Сідарэвіч пасвяціў шмат публікацый Антону Луцкевічу. І як ён сам прызнаецца, асоба Івана цікавіць яго толькі ў сувязі з тым, што ён быў братам і таварышам А. Луцкевіча. А. Сідарэвіч робіць агляд гістарыяграфіі і аналізуе спрэчныя гістарычныя моманты ў брашуры А. Луцкевіча “Памяці І. Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго”. Аўтар абагульняе матэрыялы пра ролю І. Луцкевіча ў галінах стварэння беларускай палітычнай арганізацыі, выдання партыйнай газеты і адкрыцця Аль-Кітаба менавіта як помніка беларускай мовы.

У энцыклапедычных артыкулах пра Івана і Антона Луцкевічаў, якія змяшчаюцца ў чацвертым томе “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” (Менск, 1997), даецца сціплая даведка пра іх жыццё і дзейнасць. Таксама там прыведзены абзор асноўных публікацый кожнага з іх. Энцыклапедыя змяшчае асноўныя моманты біяграфіі братоў Луцкевічаў, пры гэтым існаванне Віленскага беларускага музея толькі ўзгадваецца.

У сваім артыкуле “Нельга абысці маўчаннем”, змешчаным у часопісе Спадчына № 1 за 1991 год, Л. Крывіцкі апісвае жыццё і дзейнасць І. Луцкевіча з таго пункту гледжання, што І. Луцкевіч не толькі пакінуў выдатны след у гісторыі беларускага адраджэнцкага руху, але і даў яму моцны штуршок наперад і акрэсліў напрамак яго развіцця.

Артыкул Я. Адамовіча “Як дух змагання Беларусі (да 100х угодкаў нараджэння І. Луцкевіча)”, які змешчаны ў газеце “Беларус”, выдадзенай у 1983 годзе ў Нью-Ёрку, з’яўляецца даследаваннем жыцця і дзейнасці І. Луцкевіча. Я. Адамовіч падкрэслівае вызначальную ролю І. Луцкевіча ў беларускім Адраджэнні і ўвогуле ў беларускай гісторыі, аналізуе крыніцы, наяўнасць публікацый у савецкім друку і друку Заходняй Беларусі. Аўтар падкрэслівае малую вядомасць жыцця і дзейнасці асобы І. Луцкевіча сярод беларускіх чытачоў. Я. Адамовіч разглядае братоў Луцкевічаў у сімбіёзе, дзе без супрацоўніцтва абодвух братоў не

было б такіх вынікаў у справе беларускага Адраджэння і аналізуе іх заахвочванне і супрацоўніцтва з іншымі прадстаўнікамі беларускага нацыянальнага руху.

У першым выпуску часопіса “Беларусіка” за 1993 год змешчаны артыкул А. Каўкі “Іван Луцкевіч - Адраджэнец”. Аўтар вылучае пяць галоўных накірункаў адраджэнскай працы І. Луцкевіча і яго ролю ў кожным накірунку: Беларуская газета, Беларуская палітыка, Беларускі музей, Беларуская школа, Беларуская навука. А. Каўка ў сваім артыкуле зазначае прынцыпова адметны змест, унесены І. Луцкевічам у музейнае будаўніцтва, і надае шмат увагі яго пісьмовай творчасці.

Артыкул А. Смаленчука “Краёвец Антон Луцкевіч”, які быў змешчаны ў часопісе “Гістарычны альманах” у 1998 годзе, прысвечаны выдавецкай дзейнасці А. Луцкевіча ў 1912 - 1915 гадах і яго адносінам да "краёвай ідэалогіі". Артыкул грунтуецца на даследаванні дзённіка Міхала Ромера, які ахоплівае перыяд з 1911 па 1915 гады, публікацый віленскіх выданняў "Вечерней газеты" і "Кур'ера краёвага". Артыкул з’яўляецца каштоўным матэрыялам па аналізу палітычных поглядаў А. Луцкевіча і, на падставе гэтага, яго грамадскай і творчай дзейнасці.

Да даследаванняў, прысвечаных толькі працы музея і музейнай калекцыі Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча, адносяцца наступныя працы: артыкул А. Ліса “Матэрыялы Віленскага беларускага фонда” [10, с. 112-123], кніга Лабынцава Ю. “Архіў беларускага Адраджэння”, артыкул Г. Запартыкі “Перспектывы навуковай рэканструкцыі музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні” [34, с. 178-183], каталог выставы Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі “Спадчына, якая належыць Беларусі”.

Артыкул А. Ліса “Матэрыялы Віленскага беларускага фонда” са зборніка А. Мальдзіса “Вяртанне 6: Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах” (Менск, 1999) дае поўнае апісанне і пералік матэрыялаў рукапіснага фонду № 21 Бібліятэкі Літоўскай акадэміі навук, які быў сфарміраваны на базе архіўных матэрыялаў Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча. Гэты матэрыял мае вялікае значэнне для даследавання фондаў былога Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча і гісторыі беларускага Адраджэння ў Вільні ў пачатку ХХ ст.

У сваёй кнізе “Архіў беларускага Адраджэння” Ю. Лабынцаў адзначае, якую ролю іграў музей у перыяд нацыянальнага беларускага Адраджэння, распавядае пра калекцыі музея, выдзяляя з іх найбольш каштоўныя на яго пункт гледжання рэчы, падымае праблему недаследаванасці шматлікіх рукапісаў у архівах музея. Каштоўным для вывучэння лёсу калекцый музея з’яўляецца прыведзены Ю. Лабынцавым спіс архіваў Беларускага музея, якія былі забраны НКУС Літвы ў 1944 годзе.

У артыкуле “Перспектывы навуковай рэканструкцыі музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні” (Менск, 1997), змешчаным у зборніку матэрыялащ міжнароднай навуковай канферэнцыі ў Менску 19 - 20 чэрвеня 1997 года “Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкрыстання”, Г. Запартыка распавядае пра гісторыю Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча, яго калекцыі, гісторыю ліквідацыі музея, прапаноўвае ідэю яго навуковай рэканструкцыі і аналізуе перспектывы такой рэканструкцыі. Навуковая рэканструкцыя музея мела бы вялікае значэнне для даследавання гісторыі Беларусі на аснове вывучэння экспанатаў музея.

Вынікам выставы Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі “Спадчына, якая належыць Беларусі” стала стварэнне каталога з падрабязным апісаннем калекцый выяўленчага мастацтва, іканапісу, культавых рэчаў, музычных інструментаў, скульптуры, сфрагістыкі, керамікі, археалогіі, дакументаў і фатаграфій былога Віленскага беларускага музея. Каталог дапамагае выявіць лес некаторых экспанатаў пасля ліквідацыі музея імя І. Луцкевіча.

Да працаў, дзе дзейнасць Віленскага беларускага музея і братоў Луцкевічаў толькі закранаецца, належаць наступныя даследаванні: аўтарэферат А. А. Гужалоўскага “Станаўленне і развіццё музейнай справы Беларусі (1918-1941 гг.)” (Менск, 2002), брашура Л. Луцкевіча і Г. Войцік “Марыян Пецюкевіч”, артыкул А. Смалянчука “З гісторыі віленскага масонства пачатку ХХ ст.” [38].

Важным вынікам даследчай справы А. А. Гужалоўскага з’яўляецца аналіз існавання ў Вільні ў рамках нацыянальна-культурнага руха на “крэсах усходніх” Беларускага музея імя І. Луцкевіча. Аўтар даследуе гісторыю існавання музея ў рамках музейнай справы Беларусі.

Брашура Л. Луцкевіча і Г. Войцік “Марыян Пецюкевіч” (Вільня, 2001) змяшчае кароткую даведку пра музейную дзейнасць Марыяна Пецюкевіча ў Віленскім беларускім музеі імя І. Луцкевіча ў 1940 - 1941 гадах і пра лёс самога музея.

У артыкуле “З гісторыі віленскага масонства пачатку ХХ ст.”, надрукаванага ў часопісе “Спадчына” ў 1998 г., А. Смалянчук прадстаўляе нарыс з гісторыі віленскага масонства пачатку ХХ стагоддзя і фрагменты дзенніка М. Ромера, вядомага юрыста, навукоўца, публіцыста і палітычнага дзеяча Літвы, у перакладзе з польскай мовы А. Смаленчука. Гэты артыкул уяўляе вялікую цікаўнасць, таму што непасрэднае дачыненне да масонства пачатку ХХ ст. мелі вядомыя дзеячы беларускага руху - браты Луцкевічы.

Шмат для папулярызацыі гісторыі музея і яго стваральнікаў зрабіў У. Арлоў. Для даследавання былі выкарыстаны яго публікацыі: “Дзесяць вякоў беларускай гісторыі” (Менск, 1997), якая была напісана сумесна з Г. Сагановічам, і “Краіна Беларусь: ілюстраваная гісторыя” (Славакія, 2003). Пра дзейнасць братоў Луцкевічаў У. Арлоў распавядае ў кантэксце

беларускага нацыянальнага Адраджэння. Трэба адзначыць, што гэтыя творы носяць у асноўным публіцыстычны характар.

У падручніках па гісторыі Беларусі ў кантэксце беларускага нацыянальнага Адраджэння пачатку ХХ ст. мы знаходзім звесткі пра дзейнасць братоў Луцкевічаў. Былі прааналізаваны наступныя падручнікі: "Нарыс гісторыі Беларусі" Шыбекі З. В. (Менск, 2003), "Найноўшая гісторыя Беларусі" Я. Мірановіча (Беласток, 2000), дакументы і матэрыялы, звязаныя з дзейнасцю А. Луцкевіча, змешчаныя ў хрэстамытаі "Гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у дакументах і матэрыялах" (Вільня, 2007).

У "Нарысе гісторыі Беларусі" З. В. Шыбекі браты Іван і Антон Луцкевічы згадваюцца ў сувязі з іх палітычнай, грамадскай і культурнай дзейнасцю: стварэннем палітычнага аб'яднання "Беларускай рэвалюцыйнай грамады", дзейнасцю партыі "Беларускай Сацыялістычнай Грамады", выдавецтвам газет "Наша доля", "Наша ніва", этнаграфічнай і археалагічнай дзейнасцю І. Луцкевіча, дзейнасцю Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны, Беларускага народнага камітэта, Рады Беларускай народнай рэспублікі, дзейнасцю А. Луцкевіча па распрацоўцы беларускага правапісу і нормаў граматыкі, палітычнай, літаратурнай і музейнай дзейнасцю А. Луцкевіча.

У хрэстаматыі "Гісторыя Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у дакументах і матэрыялах" змешчаны наступныя даследаванні: артыкулы "Беларуская ідэя ў кантэксце нацыястваральных працэсаў у Еўропе (пачатак XX ст.)" А. Смаленчука, "Антон Луцкевіч і краёвая ідэалогія". Гэтыя артыкулы дазваляюць зразумець палітычны кантэкст, у якім праходзіла культурніцкая дзейнасць Антона і Івана Луцкевічаў у пачатку XX ст., а таксама іх палітычныя погляды.

У падручніку "Найноўшая гісторыя Беларусі" Я. Мірановіча разглядаецца гісторыя беларускай нацыі ад канца XIX стагоддзя да нашых дзен. Браты Іван і Антон Луцкевічы ўзгадваюцца тут як стваральнікі арганізацый Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада, рэдактары газеты "Наша доля", арганізатары і рэдактары газеты "Наша ніва", выдаўцы "Універсала Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага" ў 1915 годзе. Таксама ўзгадваецца дзейнасць прэм'ера урада БНР Антона Луцкевіча і дзейнасць арганізацыі "Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый", у стварэнні якой ён прымаў непасрэдны ўдзел.

У заключэнні трэба адзначыць, што ў беларускай гістарыяграфіі даследаванымі з'яўляюцца палітычная і грамадская дзейнасць братоў Луцкевічаў, у тым ліку ў галіне беларускага школьніцтва і выдавецтва беларускіх газет, дзейнасць І. Луцкевіча па збіранню музейнай калекцыі, літаратурная дзейнасць А. Луцкевіча. Даследаваны былі ў некаторай

ступені і найбольш каштоўныя з пункту гледжання шэрагу даследчыкаў экспанаты Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча.

### 1.2. Крыніцы

Культурніцкая дзейнасць братоў Луцкевічаў, дзейнасць музея і яго лёс пасля арышту А. Луцкевіча асвятляецца ў наступных крыніцах: успаміны Ю. Вітан-Дубейкаўскай пра І. Луцкевіча [7], успаміны Я. Багдановіча пра Беларускі прытулак у Вільні і Віленскую беларускую гімназію [5], зборнік “Памяці І. Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго” з успамінамі пра асобу Івана Луцкевіча А. Будзькі, М. Гарэцкага, Л. Родзевіча, А. Сегеня, М. Кахановіча, Я. Салаўя, К. Душэўскага [31], заметкі пра Віленскі Беларускі музей імя І. Луцкевіча ў газетах “Голас Беларуса” і “Беларуская Ніва” за 1924 – 1926 гады, успаміны Я. Шутовіча пра Віленскі беларускі музей [47, с. 24-46], успаміны М. Пецюкевіча пра Віленскі беларускі музей [32, с. 77-85], “Інвентарная кніга Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча” [16-20], зборнік дакументаў і матэрыялаў па следчай справе НКУС БССР А. Луцкевіча.

Ю. Вітан-Дубейкаўская вельмі дэталёва апісвае сваё жыццё і дзейнасць у Вільні, у прыватнасці знаёмства з І. Луцкевічам. Яе звесткі носяць характар успамінаў і з’яўляюцца каштоўным матэрыялам для разумення характару І. Луцкевіча, яго мэтаў у жыцці і адданасці працы ў галіне беларускага Адраджэння. Успаміны носяць яркую эмацыянальную афарбоўку. Са сведчанняў Ю. Вітан-Дубейкаўскай мы даведваемся, што І. Луцкевіч зусім не турбаваўся наконт свайго здароўя, а наадварот, нягледзячы на свой дрэнны стан здароўя, ён працягваў пошукі экспанатаў для калекцыі і актыўна займаўся палітычнай дзейнасцю. Можна адзначыць, што назіраецца празмерная ідэалізаванасць вобраза І. Луцкевіча. Таксама ўспаміны змяшчаюць і некаторыя звесткі пра жыццё і палітычную, грамадскую і культурніцкую дзейнасць А. Луцкевіча.

З успамінаў супрацоўніка “Віленскай праўды” Янкі Багдановіча, які з’яўляўся вучнем Віленскай беларускай гімназіі і пражываў у Беларускім прытулку, што таксама знаходзіўся ў Базыльянскіх мурах, можна даведацца пра дакладнае размяшчэнне Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча ў будынку Базыльянскіх муроў.

У біяграфічным нарысе “Памяці І. Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго”, выдадзеным у 1920 годзе, змешчаны дэталёвая біяграфія І. Луцкевіча, а таксама ўспаміны А. Будзьку, М. Гарэцкага, Л. Родзевіча, А. Сегеня, М. Кахановіча, Я. Салаўя, К. Душэўскага. Артыкул “Жыццё і праца Івана Луцкевіча” апісвае не толькі біяграфію І. Луцкевіча, але і абазначае

прычынна-следчыя сувязі паміж дзейнасцю Івана і яго выхаваннем, атрыманай адукацыяй, прынцыпамі і ідэямі.

У газетах “Голас Беларуса” і “Беларуская Ніва”, якія выдаваліся ў 1924 – 1926 гадах, у раздзеле “Хроніка Заходняй Беларусі” можна знайсці нешматлікія заметкі пра Віленскі Беларускі музей імя І. Луцкевіча. З гэтых заметак можна даведацца пра наведванне музея польскімі паслам і сенатарамі і пра іх ацэнку музея і ўвогуле беларускіх установ, пра публічныя лекцыі А. Луцкевіча ў Віленскай беларускай гімназіі і іх агляд, аб спробах высяліць музей з памяшкання Базыльянскіх муроў, пра перашкоды матэрыяльнага характара ў дзейнасці Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча.

Успаміны М. Пецюкевіча пра музей, які некаторы час пасля арышту А. Луцкевіча быў яго дырэктарам, былі надрукаваны ў часопісе “Спадчына” ў 1995 годзе. М. Пецюкевіч з’яўляўся непасрэдным сведкам падзей, звязаных з лесам музея. Ён распавядае пра працу музея напярэдадні Другой сусветнай вайны і напачатку гітлераўскай акупацыі, пра кіраўніцтва музея, супрацоўнікаў, аддзелы музея, лёс калекцый музея падчас вайны. М. Пецюкевіч у сваіх успамінах дае высокую ацэнку дзейнасці менавіта А. Луцкевіча ў музейнай справе і надае яму галоўную заслугу ў захаванні экспанатаў ад знішчэння.

Успаміны Я. Шутовіча, які ў час Другой сусветнай вайны ў 1941 – 1944 гадах быў апошнім беларускім дырэктарам Віленскага музея імя І. Луцкевіча, былі надрукаваны ў часопісе “Спадчына” ў 1995 годзе. Дзейнасць Я. Шутовіча прыкметна тым, што ён здолеў уратаваць значную частку экспанатаў ад вывазу ў час вайны. Успаміны Я. Шутовіча носяць характар успамінаў. Яго тэкст з’яўляецца вельмі дэтальным апісаннем працэса ліквідацыі музея і дальнейшага лёсу яго экспанатаў.

У часопісах “Спадчына” № 1 - 5 1995 года была надрукавана поўная “Інвентарная кніга” музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні. (Гл. Дадатак 2) Яе стварэнне было распачата 3 чэрвеня 1922 года. Інвентарная кніга дае дэталёвае апісанне прадметаў і замалёўкі некаторых з іх, выкананыя П. Сергіевічам. Захаваны правапіс і стылёвыя асаблівасці мовы “Інвентарнай кнігі”. Прадметы падзелены па наступных аддзелах: A. Калекцыя персцянёў; B. Крыжы і абразкі з медзі; C. Абразкі святыя; D. Абразкі на мэталю і воты; E. Клярмы, бляхі, аздобы да конскае збруі; F. Клярмы, аздобы і т. п.; G. Гудзікі і засцёжкі да адзежы; H. Прылады да мукаў; I. Пячаткі; K. Дагістарычныя выкапні; M. Мэблі, хатнія рэчы; N. Разьба з дрэва; O. Гравэрскія бляхі; P. Вопратка, тканіны, царкоўныя апараты; R. Судзьдзе (медзь, цына, гліна, шкло, фаянс); S. Малярства; T. Фольклёр; U. Рысункі ручныя ў папках; V. Зброя; W. Кафлі, цэглы.

Зборнік дакументаў і матэрыялаў па следчай справе НКУС БССР А. Луцкевіча з уводзінамі і каментарамі В. Н. Міхнюка, Н. М. Клімовіча і А. Н. Геся быў выдадзены ў 1997 г. пасля таго, як быў зняты грыф "сакрэтнасці" і дакументы сталі даступнымі даследчыкам. Зборнік утрымлівае ўласныя паказанні А. Луцкевіча ад 30 кастрычніка і 17 лістапада 1939 года, напісаныя ім у казематах Вільні, і 6 пратаколаў допытаў, якія былі праведзены следчымі НКУС БССР у Менску ў лістападзе 1939 года – сакавіку 1940 года на прадмет верыфікацыі яго ўласных паказанняў. У паказаннях А. Луцкевіча дана перыядызацыя яго дзейнасці, падрабязна ахарактарызавана гісторыя беларускага нацыянальнага руху з 1902 па 1939 гады, асноўныя падзеі жыцця Антона і яго грамадска-палітычная дзейнасць. Трэба зазначыць, што гэта спецыфічныя дакументы, бо ствараліся яны ў абставінах жорсткага маральнага, інтэлектуальнага і фізічнага супрацьстаяння двух бакоў. Можна адзначыць, што ў Асобым архіве Літвы змяшчаецца ўся следчая справа, з якой толькі нязначная частка ўвайшла ў выданне В. Н. Міхнюка.

Такім чынам, існуе шэраг даследаванняў, артыкулаў, прысвечаных жыццю і дзейнасці Івана і Антона Луцкевічаў. Пры гэтым у большай ступені даследаваны біяграфіі беларускіх дзеячаў, іх палітычная і грамадская дзейнасць у перыяд беларускага Адраджэння пач. ХХ ст.

Крыніцамі па правядзенню аналітычнага апісання фондаў з'яўляюцца наступныя архіўныя матэрыялы: Фонд 21 аддзела рукапісаў і аддзел старадрукаў бібліятэкі Акадэміі Навук Літвы ў г. Вільні, фонд 3 ("Наша Ніва") у Цэнтральным дзяржаўным архіве–музеі літаратуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь у г. Мінску.

Трэба зазначыць, што крыніцы па жыццю і культурніцкай дзейнасці братоў Івана і Антона Луцкевічаў носяць у асноўным характар успамінаў. Не ўсе з існуючых крыніц належным чынам прааналізаваныя. Пра Антона Луцкевіча ў апошняе дзесяцігоддзе з'явілася шмат даследаванняў. На сенняшні дзень вельмі грунтоўна даследавана літаратурная, выдавецкая і палітычная дзейнасць Антона Луцкевіча. Гэта ў асноўным даследаванні А. Сідарэвіча. Але асоба славутага беларуса яшчэ не атрымала належнай ацэнкі гісторыкаў. У прыватнасці, даследаванне існавання і дзейнасці Віленскага беларускага музея ў асноўным звязана з іменем Івана Луцкевіча, пры гэтым не даследавана роля малодшага брата Антона ў стварэнні музейнай калекцыі і гісторыі музея і яго ролі ў развіцці беларускай культуры. Неабходна на падставе інсуючых крыніц даследаваць культурніцкую дзейнасць А. Луцкевіча ў галіне музейнай справы і ролю Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча ў беларускім Адраджэнні пачатку ХХ ст. Даследаванне належыць правесці ў кантэксце ўсёй грамадскай і культурнай дзейнасці братоў Луцкевічаў.

Культурніцкай дзейнасці Івана і Антона Луцкевічаў прысвечаны шэраг дасследаванняў, якія абапіраюцца на існуючыя крыніцы. Існуюць толькі некалькі дасследаванняў калекцый Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча, гэта артыкул А. Луцкевіча “Беларускі музей імя Івана Луцкевіча”, надрукаваны ў Гадавіку Беларускага Навуковага Таварыства ў 1933 годзе і кніга “Архіў беларускага Адраджэння” Ю. Лабынцава. Адсутнічаюць грунтоўныя дасследаванні па прадметах, якія захоўваліся ў музеі і ўяўлялі вялікую культурную каштоўнасць. Неабходна на падставе “Інвентарнай кнігі” музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні дасследаваць характар збору Івана Луцкевіча, фонды музейных калекцый, нацыянальную прыналежнасць прадметаў гісторыі і мастацтва, якія захоўваліся ў Віленскім беларускім музеі. Таксама неабходна на падставе існуючых крыніцаў: успамінаў Я. Шутовіча, М. Пецюкевіча прааналізаваць лес музейнай калекцыі пасля арышту А. Луцкевіча і дасследаваць месцазнаходжанне экспанатаў музея.

У заключэнні трэба адзначыць, што роля Антона Луцкевіча ў стварэнні беларускага музея не менш важная чым роля Івана. Менавіта ён стварыў музей і быў захавальнікам яго фондаў. Беларускі музей ў Вільні адыгрываў вялікае значэнне ў кантэксце беларускага нацыянальнага Адраджэння ў пачатку XX ст., і гэтае значэнне не раскрыта і па сённяшні дзень. Відавочна актуальнасць усебаковага вывучэння гісторыі музея, жыцця і дзейнасці яго стваральнікаў і захавальнікаў - братоў Луцкевічаў. Аналіз навуковай літаратуры пра братоў Луцкевічаў дае падставу сцвярджаць, што яе колькасць з кожным годам павялічваецца, але грунтоўнага, манаграфічнага дасследавання пра дзейнасць адраджэнцаў і пра гісторыю Віленскага беларускага музея імя Івана Луцкевіча яшчэ не з’явілася. Таму ў рамках дасследавання належыць ахарактарызаваць дзейнасць братоў Луцкевічаў па развіццю беларускай культуры і ролю кожнага з іх у стварэнні і дзейнасці Віленскага беларускага музея, зрабіць аналітычнае апісанне фондаў і апісаць лёс музейнай калекцыі пасля арышту Антона Луцкевіча.

# 2. БРАТЫ ЛУЦКЕВІЧЫ І БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У XX СТ.

Браты Іван і Антон Луцкевічы зрабілі вялікі ўнёсак у беларускае нацыянальнае Адраджэнне пачатку XX ст. Яны абодва былі вядомымі палітычнымі і грамадскімі дзеячамі, але калі І. Луцкевіч у першую чаргу быў вучоным, археолагам і гісторыкам, то А. Луцкевіч з'яўляўся палітыкам, гісторыкам, публіцыстам і літаратурным крытыкам.

Галоўнай дзейнасцю Івана Луцкевіча была культурна-асветніцкая, якая на пач. XX ст. спалучалася з актыўнай палітычнай дзейнасцю. На працягу ўсяго свайго жыцця І. Луцкевіч збіраў калекцыю старасвеччыны дзеля стварэння Беларускага нацыянальнага музея, які бы меў вялікае значэнне для нацыянальнага Адраджэння, бо захоўваў памяткі беларускай гісторыі і служыў адукацыйным мэтам беларусаў у Вільні. У культурніцкай дзейнасці А. Луцкевіча вылучаецца праца у музеі ў якасці яго загадчыка, праца ў якасці выкладчыка і лектара ў Беларускім навуковым таварыстве, Таварыстве беларускай школы, Беларускім студэнцкім саюзе, Таварыстве прыяцеляў беларусаведы, праца ў якасці літаратурнага крытыка і беларусазнаўца. Такім чынам, А. Луцкевіч папулярызаваў і ахоўваў творчасць беларускіх пісьменнікаў, мастакоў і беларускую спадчыну. Абодва браты спрыялі пашырэнню асветы і адукацыі сярод беларускага насельніцтва.

## 2.1. Маладыя гады. Пачаткі беларускага руху

Луцкевіч Іван Іванавіч нарадзіўся 28 мая 1881 года ў г. Шаўлі, Ковенскай губерні (цяпер г. Шаўляй, Літва). Антон Іванавіч Луцкевіч нарадзіўся 30 студзеня 1884 года. Браты Луцкевічы паходзілі са збяднелай шляхты даволі старажытнага роду ў Менскай губерні. Аб гэтым сведчыць фамільны герб “Навіна”, пісьмовыя звесткі пра які маюцца з XIV ст. [22, с. 10]

На выбар жыццёвага шляху І. Луцкевіча шмат паўплывала яго выхаванне ў сям'і, атрыманая адукацыя і людзі, якія яго атачалі. Бацька Іван Якімавіч Луцкевіч быў вайскоўцам: удзельнічаў у Крымскай вайне, быў паранены і дэмабілізаваны. Жывучы ў маёнтку ў Тарасевічах Бабруйскага павета, Іван Якімавіч меў прыяцельскія адносіны з беларускім паэтам В. Дуніным-Марцінкевічам, што будзе ўплываць на далейшае выхаванне яго сыноў - братоў Луцкевічаў. Як сведчыць зварот В. Дуніна-Марцінкевіча да Івана Якімавіча Луцкевіча, ён не цураўся беларускасці і шанаваў мову “простага” народа. [22, с. 10] Калі нарадзіўся І. Луцкевіч, Іван Якімавіч працаваў на чыгунцы ў Шаўлях.

Маці братоў Луцкевічаў, Зофія Лычкоўская, паходзіла з небагатай шляхецкай сям'і, якой належаў фальварак Ракуцёўшчына каля мястэчка Краснае.

Як свечыць біяграфічны нарыс 1920 года, “сям’я Луцкевічаў жыла ўспамінамі аб напалеонаўскім паходзе і паўстаннях 1831 і 1863 гадоў, шанавала ідэалы дэмакратызма і жыла паўстанчаскімі настроямі, у ёй заўседы панаваў шчыра дэмакратычны дух, - і гэтым духам былі прасякнуты дзеці, што шукалі ў школе дружбы не панічоў, а сыноў мужыцкіх”. [31, с. 5] Ёсць звесткі, што дзядзька братоў Луцкевічаў Сцяпан Луцкевіч удзельнічаў у паўстанні 1863 года і быў расстраляны царскімі карнікамі ў Менску. [22, с. 10] Браты Луцкевічы былі выхаваны ў шляхецкіх традыцыях і паняццях гонару - яны рана ўсвядомілі сябе беларусамі. Цікавасць да беларускай гісторыі, нацыянальных праблемаў стала галоўнай справай у іх жыцці.

Таксама трэба ўзгадаць і пра характар І. Луцкевіча. Па апісанню Ю. Вітан-Дубейкаўскай ён быў энтузіястам, ідэалістам, жывым, рухавым, запальным, але наогул добрым і спагадлівым. [7, с. 65]

У 1887 годзе сям’я Луцкевічаў пераехала ў Лібавы (цяпер Ліепая, Латвія) з прычыны пераводу туды бацькі І. Луцкевіча. Там у 1890 годзе І. Луцкевіч пачаў хадзіць у Лібаўскую Мікалаеўскую гімназію. [31, с. 5]

У Мікалаеўскай гімназіі ў Лібаве вучылася шмат латышоў і літоўцаў. У народаў Латвіі і Літвы ў той час быў даволі магутны нацыянальны рух супраць немцаў у Латвіі і палякаў у Літве. Гэта адбівалася і на школьным жыцці, дзе праследжваўся яўны раздзел паміж польскімі панскімі дзецьмі і простымі вясковымі дзецьмі. І. Луцкевіч у школе сябраваў з літоўцамі. 13 – 14-гадовы хлопчык наведваў старога літоўскага рэвалюцыянера Амброзайціса. У выніку ўплыву рэвалюцыйнага настрою літоўскага дзеяча, знаёмства з гісторыяй і культурай Беларусі, І. Луцкевіч усведамляе, што і беларускі народ, які ён сустракаў на вёсцы ў Вілейскім павеце ў ваколіцах мястэчка Краснага, мае роўныя з латышамі і літоўцамі правы на нацыянальнае самавызначэнне і развіццё ўласнай мовы.

У 1895 годзе сям’я Луцкевічаў перабралася ў Менск. Каб не зрываць ходу навукі, І. Луцкевіча спярша пакінулі далей вучыцца ў Лібаве. Але яго бацька праз паўгода пасля пераезду ў Менск памёр. У 1897 г. маці забрала Івана да сябе ў горад, дзе ён паступіў у пяты клас Менскай гімназіі. [31, с. 7]

Антон Луцкевіч у значнай ступені пад уплывам свайго старэйшага брата Івана ўжо са школы быў захоплены беларускай нацыянальнай ідэяй. Знаёмячыся з гісторыяй Беларусі і беларукага народа, яны марылі пра нацыянальнае Адраджэнне беларусаў, пра з’яўленне нацыянальнай інтэлігенцыі. У школьных гуртках у той час яны знаёміліся з сацыяльнымі навукамі і асноўнымі палажэннямі Карла Маркса, што ў далейшым паўплывала на іх палітычныя погляды.

А. Луцкевіч адзначаў, што яшчэ ў Менскай гімназіі ён і яго брат І. Луцкевіч усвядоміліся і нацыянальна, і сацыяльна, і пачалі гуртаваць вакол сябе болей-меней свядомых беларусаў. [26, с. 7] Там, пазнаёміўшыся з беларускім мастаком, паэтам і перакладчыкам К. Каганцом, браты Луцкевічы арганізавалі гімназічны гурток, у занятках якога значнае месца займала беларуская тэматыка. Нацыянальнае самаўсведамленне ў гуртку – гэта вынік зацікаўленнасці гісторыяй свайго краю, заўважанага парадаксальнага становішча шырокіх працоўных мас насельніцтва Беларусі, якое гаворыць на чужых мовах, церпіць прыгнет з боку паноў, чыноўнікаў. У душы Івана гэтыя супярэчлівасці выклікалі здзіўленне і абурэнне, жаданне змяніць такое становішча.

З успамінаў А. Луцкевіча можна даведацца, што ў братоў Луцкевічаў збіраўся ў Менску і інтэрнацыянальны гурток, у якім яны займаліся сацыяльнымі пытаннямі. [26, с. 8] Сярод яго сябраў былі Кропотов, Гэрцык, Чапінскі і інш. Яны заклалі беларускую бібліятэчку з кніжкамі па беларускай гісторыі і этнаграфіі. І. Луцкевіч, як знаўца гісторыі, будзіў і развіваў у сяброў гуртка нацыянальную свядомасць. Трэба зазначыць, што з гэтага гуртка выйшаў цэлы рад актыўных працаўнікоў на беларускай адраджэнскай ніве.

У 1902 годзе браты скончылі Менскую гімназію і паехалі у Пецярбург. І. Луцкевіч паступіў на юрыдычны факультэт і адначасова ў археалагічны інстытут, які даваў грунтоўныя веды ў галіне тэорыі і практыкі працы з помнікамі матэрыяльнай культуры. Ужо ў Пецярбургу браты Луцкевічы распачалі прапаганду беларускай нацыянальнай ідэалогіі.

У 1902 г. браты Луцкевічы і Вацлаў Іваноўскі, тады студэнт тэхналагічнага інстытуту, арганізавалі “Беларускі кружок народнай асветы”. І. Луцкевіч адрэдагаваў першую адозву кружка да грамадзянства Краю, прызываючы да выпаўнення натуральнага абавязку перад беларускім народам: да нясення ў веску асветы на беларускай мове. [31, с. 7] Адозва клікала ўсіх грамадзян Беларусі – незалежна ад іх культурна-нацыянальнай прыналежнасці – працягнуць руку помачы беларускім масам, каб яны маглі стаць на ўласныя ногі і вызваліцца культурна ад чужынцаў. [26, с. 9] Мэтай гуртка было стварэнне беларускай школьнай адукацыі і выдавецтва беларускіх кніг.

Горад Пецярбург быў прыдатным для разгортвання там беларускай грамадскай дзейнасці, бо там ва універсітэтах было шмат моладзі з Беларусі і ў мінулым ўжо былі спробы гуртаваць беларускае студэнцтва на нацыянальным грунце.

Як сведчыць А. Будзька, І. Луцкевіч умеў вышукваць беларускіх прыхільнікаў, умеў зацікавіць беларускім рухам: “На яго гледзячы і ад яго шмат налаўчыўшыся сталі старасвеччыну вышукваць разам з ім, а пасля і самі адны Вацлаў Ластоўскі і Зямкевіч Рамуальд”. [6, с. 18] І. Луцкевіч аказваў уздзеянне на людзей не толькі асабістым падыходам да кожнага чалавека, сваёй спагадлівасцю і шчырасцю, але і поўнай адданасцю і ахвяраванню

свайго здароўя і асабістага шчасця сваёй ідэі і свайму ідэалу “ўваскрэсіць сваю Бацькаўшчыну да новага – лепшага, незалежнага жыцця”. [7, с. 178] Акрамя гэтага ўменне прыцягваць людзей да нацыянальнай працы І. Луцкевіч валодаў уменнем арганізаваць гэтых людзей і актывізаваць іх у арганізацыйнай працы.

Пад уплывам сувязей з інтэлігенцыяй, рабочымі, сялянамі і студэнтамі І. Луцкевіч прымаў ідэі марксісцкай філасофіі, сацыялізму, лозунгі змагання за сацыяльную справядлівасць. У 1903 годзе ён разам з В. Іваноўскім і А. Луцкевічам засноўвае беларускую палітычную арганізацыю пад назвай “Беларуская Рэвалюцыйная Грамада” на базе ўжо існуючай Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі. Яе ўдзельнікамі былі беларускія студэнты пецярбургскіх вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку В. Іваноўскі і А. Луцкевіч. Аднак, як зазначае сам А. Луцкевіч, ён ні па свайму тэмпераменту, ні па складу розуму не быў рэвалюцыйным дзеячам, усе яго памкненні былі накіраваныя галоўным чынам на культурна-асветніцкую і часопісную працу. [2, с. 28] Беларуская Рэвалюцыйная Грамада змагалася супраць царскай улады за дэмакратычны лад, патрабавала нацыянальнай свабоды для беларусаў: школы на роднай мове і роўных для яе правоў у краі. Былі створаны яшчэ два цэнтры Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады: у Менску з удзелам К. Кастравіцкага, А. Трэпкі, А. Уласава, А. Шабуні, у Вільні – А. Пашкевіч, братоў Умястоўскіх, Ф. Стацкевіча, А. Бурбіса. І. Луцкевіч прымаў удзел ва ўсіх асноўных мерапрыемствах Грамады і каардынаваў працу яе паасобных цэнтраў. Ён так растлумачваў свае заняткі палітыкай: “Што да палітыкі, то я ёй служу ад маладых гадоў, каб узгадаць беларускі народ да самастойнага жыцця”. [7, с. 31]

У сваёй дзейнасці Беларуская Рэвалюцыйная Грамада кіравалася прынцыпамі інтэрнацыянальнай салідарнасці, супрацоўніцтва з рэвалюцыйнымі партыямі суседніх паняволеных народаў. Гэтых жа прынцыпаў у палітычнай і грамадскай дзейнасці на працягу свайго жыцця трымаўся і І. Луцкевіч. Трэба адзначыць, што напачатку дзейнасць Грамады мела больш сацыялістычныя мэты, а нацыянальнае пытанне разглядалася толькі як сродак прапаганды.

Дзеля пераўтварэння ў жыцце ідэі палітычнага вызвалення беларускага народа І. Луцкевіч супрацоўнічае з рэвалюцыйнымі партыямі другіх нацыянальнасцей Расіі. Так ён знаходзіўся ў кантакце з партыяй сацыял-рэвалюцыянераў у Пецярбургу, якая ў той час гатовіла дэманстрацыю. У 1903 годзе І. Луцкевіча арыштоўваюць на кватэры Ізмайловічанак, якія былі добра вядомы ў эсэраўскім руху. [31, с. 8] У турме ён прымаў удзел ў галадоўцы, і адтуль бярэ пачатак яго хвароба на сухоты.

Выезд за мяжу ў 1904 г. у рамках камандзіроўкі для навуковых доследаў пра Беларусь і для далейшай навукі ў Вену даў І. Луцкевічу магчымасць бліжэй пазнаёміцца з нацыянальна-

вызваленчымі рухамі іншых краін: Украіны, Польшчы. Там ён зышоўся з кіраўнікамі Польскай Партыі Сацыялістычнай і пры іх помачы наладзіў выданне беларускіх сацыялістычных брашур заграніцай і дастаўку іх кантрабандай у Беларусь. [31, с. 9]

### 2.2. Дзейнасць у перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гг. і нацыянальна-культурнага Адраджэння

І. Луцкевіч прымаў актыўны ўдзел у палітычнай працы. У 1905 годзе ён зноў прыехаў у Пецярбург з мэтай заканчэння вучобы на юрыдычным факультэце. У гэты час І. Луцкевіч ад Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады атрымаў мандат на з’езд прадстаўнікоў сацыялістычных партый у Фінляндыі. [31, с. 9] Гэта было першае прадстаўленне беларусаў на міжнароднай арэне. Такім чынам, менавіта І. Луцкевіч пачаў выводзіць беларускую справу на міжнародную арэну. У Фінляндыі ён пазнаёміўся з ірландцамі, якія выдзялілі вялікую суму грошай на дапамогу выдавецкай дзейнасці партыі.

У перыяд рэвалюцыі 1905 года І. Луцкевіч актыўна ўдзельнічаў у палітычнай дзейнасці і выступаў агітатарам не толькі сярод беларускага насельніцтва, але і на з’ездзе ў Маскве: ён ездіў па весках і гарадах, арганізоўваў мітынгі і выступаў на іх толькі па-беларуску з прамовамі, у якіх нацыянальны элемент спалучаўся з сацыяльным, аднак, па звестках біяграфічнага нарыса “Памяці І. Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго”, панаваў над ім. [31, с. 10]

І. Луцкевіч займаў адно з першых месцаў у кіраўніцтве, уваходзіў у ЦК партыі і вядзенні загранічнай палітыкі ў Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе, у якую ў 1905 годзе была перайменавана Беларуская Рэвалюцыйная Грамада. Ён меў уплыў і на іншыя нацыянальныя групы такіх партый, як сацыял-рэвалюцыянераў, сацыял-дэмакратаў і Бунда.

У 1906 годзе пачаўся новы этап у жыцці братоў Луцкевічаў і таксама ў беларускім руху, цэнтрам якога стала Вільня. Гэта было звязана з пераездам братоў Луцкевічаў на нелегальнае становішча ў Вільню, бо кватэра Луцкевічаў у Менску, з якой была звязана ўся рэвалюцыйная праца, была скампраметавана пакушэннем на менскага губернатара Курлова, арганізаваным сёстрамі Ізмайловічанкамі. [31, с. 10] На нелегальным становішчы ў Вільні яны жылі да 1908 г.

У Вільні І. Луцкевіч працягвае агітацыйную дзейнасць за барацьбу за незалежную беларускую краіну: у праваслаўнай духоўнай семінарыі ў Базыльянскіх мурах, у каталіцкай семінарыі, у свецкіх школах ён чытае вучням лекцыі аб беларусах і беларускім Адраджэнні.

У 1905 годзе была скасавана забарона друкаваць па-беларуску. Гэта выкарыстаў І. Луцкевіч: у 1906 годзе ён згуртаваў вакол сябе беларускіх пісьменнікаў, Цётку, Умястоўскага, А. Луцкевіча, і на грошы віленскага мешчаніна Івана Тукеркеса, які згадзіўся падпісваць газету

як рэдактар-выдавец, арганізаваў выданне першай беларускай легальнай газеты “Наша Доля”. Пасля ліквідацыі “Нашай Долі” 10 лістапада 1906 года была заснавана газета “Наша Ніва” па ініцыятыве і за грошы І. Луцкевіча. [31, с. 12] Увогуле І. Луцкевіч, мусіў часам прадаваць рэчы з сваёй калекцыі старасвеччыны дзеля забеспячэння існавання газеты “Наша Ніва”, правядзення беларускіх ідэйных мерапрыемстваў: выступленняў беларускага хору, тэатральнай дружыны, музыкальнага драматычнага гуртка, арганізацыі выдавецкай дзейнасці. Як зазначаецца ў біяграфічным нарысе “Памяці І.Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго”, І. Луцкевіч прадаваў толькі тыя рэчы, якія не мелі вагі для краю і беларусаў. [31, с. 14]

Штотыднёвік “Наша Ніва” быў накіраваны ў большай ступені на прапагандаванне асветнай працы з народам. Увогуле газета “Наша Ніва”, якая выходзіла да 1915 года, мела вялікае значэнне для беларускага адраджэнскага руху, бо гуртавала вакол сябе ўсіх свядомых працаўнікоў беларускага руху і ўвогуле з’яўлялася цэнтрам беларускага нацыянальнага жыцця. Менавіта адсюль зыходзіла ініцыятыва новых культурных мерапрыемстваў – арганізацыя тэатра і балета Буйніцкага, хора Рагоўскага, музыкальнага драматычнага гуртка. Накірунак газеты быў нацыянальным, памяркоўна-прагрэсіўным, пры гэтым інтарэсы сялянства ставіліся на першае месца. У ёй друкаваліся творы выдатных беларускіх пісьменнікаў. У першых гадах выдання “Нашай Нівы” І. Луцкевіч зрэдку змяшчаў там свае нататкі, фотаздымкі беларускіх краявідаў са сваёй калекцыі пад псеўданімам “Шчасны”, пад якім ён часам выступаў і ў палітычнай сферы. [1, с. 9]

Трэба зазначыць, што І. Луцкевіч у сваіх поглядах не прытрымліваўся ідэй нацыяналізму, як яго крытыкавалі савецкія гісторыкі: ён разумеў, што культурны і палітычны рост беларускага народа цесна звязаны з уздымам усяго краю. Таму І. Луцкевіч супрацоўнічаў з арганізацыямі розных нацыянальнасцей у краі. Прыкладам супрацоўніцтва з польскімі дэмакратамі з’явілася заснаванне ў 1912 годзе ў Вільні краёвага польскага органа “Kurjer Krajowy” з ініцыятывы і пры грашовай дапамозе І. Луцкевіча. Ён супрацоўнічаў з палякамі і на навуковым грунце: у 1910 годзе Таварыству прыяцелей навук (“Towarzystwo Przyjaciol Nauk”) І. Луцкевіч перадаў у карыстанне шмат рэчаў са сваёй калекцыі, забраў ён іх, калі пачалася вайна. [31, с. 15] З яўрэямі І. Луцкевіч супрацоўнічаў на грунце палітычнай і культурнай працы: партыйная работа, выбарчая агітацыя. І. Луцкевіч перадаў яўрэйскаму таварыству любіцеляў старасвеччыны калекцыю яўрэйскіх антыкаў, якія пазней былі вывезены ў Маскву пры эвакуацыі музея.

Можна таксама прыгадаць дзейнасць братоў Луцкевічаў у масонскіх ложах пач. XX ст., праца якіх была звязана з краёвай ідэалогіяй, што дапамагае зразумець паітычныя погляды братоў Луцкевічаў і іх адбітак на культурніцкай справе дзеячаў. Браты Луцкевічы былі сярод

заснавальнікаў у 1910 годзе ў Вільні ложы "Лучнасць" ("Jednosc"). [38, с. 36] Ложа была створана па ініцыятыве расейскіх масонаў, сяброў партыі кадэтаў. У "Лучнасці" былі прадстаўлены ўсе асноўныя этнасы беларуска-літоўскага краю. "Браты" прытрымліваліся прынцыпаў краёвай ідэалогіі. Увогуле краёвая ідэалогія мае непасрэдныя адносіны да поглядаў А. Луцкевіча ў гэты перыяд і яго выдавецкай дзейнасці. Галоўным пастулатам гэтай ідэалогіі была адзіная палітычная нацыя. Усе, хто ўсведамляў сябе "грамадзянамі края", на думку краёўцаў, належалі да адзінай нацыі незалежна ад этнічнага паходжання і культурнай прыналежнасці. У палітычным плане краёўцы выступалі за ўстанаўленне парламенцкай рэспублікі і аўтаномію "гістарычнай Літвы" са сталіцай у Вільні ў межах дэмакратычнай федэратыўнай Расеі. Краёўцаў-дэмакратаў аб'ядноўвала перакананне, што толькі пры дэмакратычным ладзе з'явяцца належныя ўмовы для культурнага і палітычнага развіцця ўсіх этнасаў краю.

А. Луцкевіч актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці масонскіх ложаў у Вільні. Ён уваходзіў у склад ложаў "Літва" і "Беларусь". У рамках іх дзейнасці А. Луцкевіч актыўна займаўся выдавецкай і літаратурнай дзейнасцю: ён з'яўляўся фактычным кіраўніком рускамоўнай "Вечерней газеты" і аўтарам большасці артыкулаў, самастойна распачаў выданне польскамоўнай газеты "Кур"ер краёвы". Праз гэтыя выданні А. Луцкевіч пашыраў ідэі краёвасці: ён заклікаў усіх "грамадзян Краю" да працы на ягоную карысць і на карысць народа. [38, с. 36]

Такім чынам, асноўная мэта дзейнасці братоў Луцкевічаў у масонскіх ложах была непарыўна звязана з нацыянальна-вызваленчым рухам у Беларусі і Літве, з дасягненнем пэўнай палітычнай самастойнасці края.

Падчас першай сусветнай вайны І. Луцкевіч у Вільні адстойваў інтарэсы беларускага насельніцтва краю, актыўна ўдзельнічаў ў працы Беларускага камітэта дапамогі пацярпелым ад вайны, які кіраваў эканамічнай і школьнай працай.

Яшчэ адным доказам краёвасці І. Луцкевіча была арганізацыя ім у гэты ж час міжнацыянальнай палітычнай ўстановы “Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага”, якая павінна была злучыць беларускія, літоўскія, польскія і яўрэйскія дэмакратычныя элементы і мела на мэце аднаўленне дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага. Першы універсал “Канфедэрацыі” ў снежні 1915 года быў напісаны І. Луцкевічам на чатырох мовах. [31, с. 20] Аднак, аднаўленне беларуска-літоўскай дзяржавы не было магчымым пры нямецкай акупацыі, бо гэта не супадала з палітычнай канцэпцыяй немцаў, якія гатовы былі стварыць “малую Літву” на аснове далучэння яе да Нямеччыны, але без адраджэння беларуска-літоўскай дзяржавы. Да таго ж улетку 1916 года І. Луцкевіч удзельнічаў у з'ездзе Народаў у Лёзанне, дзе яго

незалежніцкія выступленні не супадалі з планам немцаў далучыць да Нямеччыны "малую Літву".

У 1915 г. у Вільні адчынілася першая беларуская пачатковая школа, але кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў у гэты час не хапала. У снежні І. Луцкевіч і Цётка стварылі настаўніцкія курсы, дзе выкладалі Іван і Антон Луцкевічы. Пасля адкрыцця 5 беларускіх пачатковых школаў у 1916 г. па ініцыятыве І. Луцкевіча быў арганізаваны Беларускі настаўніцкі саюз. У той жа час ён працаваў як скарбнік кааператыва "Райніца", арганізаваў Беларускую Сацыял-Дэмакратычную Работніцкую Групу, працаваў як член законспіраванага палітычнага цэнтру "Беларускага Народнага Камітэту".

Улетку 1916 года пры актыўнай працы І. Луцкевіча быў адчынены Беларускі клуб, дзе ён быў абраны за прэзаса. Як сведчыць Ю. Вітан-Дубейкаўская, менавіта І. Луцкевіч знайшоў памяшканне для клубу на вуліцы Вялікай. Ён дамовіўся з уладальнікам рэстарана Нарушэвічам, што за малую плату ўсё памяшканне з інвентаром было аддадзена ў карыстанне Беларускаму клубу. [7, с. 64]

У 1916 годзе А. Луцкевіч працаваў у рэдакцыі беларускай газеты "Гоман" тэхнічным рэдактарам і адначасова выкладаў на настаўніцкіх беларускіх курсах. [2, с. 36]

На працягу свайго жыцця І. Луцкевіч спрабаваў пераўтварыць у жыццё ідэю аднаўлення дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага. Так, напрыклад, на з'ездах краёвай інтэлігенцыі ў Вільні, напярэдадні рэвалюцыі, І. Луцкевіч бараніў ідэю аднаўлення дзяржаўнасці Вялікага княства Літоўскага, выступаючы ад імя беларускіх арганізацый. Неабходнасць аднаўлення Вялікага княства Літоўскага І. Луцкевіч растлумачваў агульнай гісторыяй беларусаў і літвінаў і неабходнасцю дзеля аднаўлення незалежнасці "шукаць перш за ўсё згоды і саюзу з літвінамі". [31, с. 47] З успамінаў М. Кахановіча мы даведваемся, што на сходзе віднейшых беларускіх дзеячаў у Магілёве ўлетку 1917 года І. Луцкевіч рабіў даклад аб агульным палажэнні беларускай справы. Там ён прызываў усіх трымацца лозунгу "непадзельная і незалежная Беларусь" і бараніў патрэбнасць цеснага кантакту беларусаў з украінцамі і літоўцамі, як бліжэйшымі суседзямі, і ўвогуле ўсімі тымі народамі, якія знаходзіліся пад гнетам расейскага царызму. [31, с. 47]

Браты Луцкевічы сваёй актыўнай палітычнай працай і мітынгамі дабіваюцца склікання ў Вільні беларускай нацыянальнай канферэнцыі дзеля стварэння беларускага прадстаўнічага органу. Канферэнцыя адбылася ў Вільні 25, 26 і 27 студзеня 1918 года. [31, с. 23] Маршалкам канферэнцыі быў А. Луцкевіч. Канферэнцыя выбрала І. Луцкевіча у склад Беларускай Рады – галоўнага нацыянальнага прадстаўніцтва беларусаў у межах акупацыі. 25 сакавіка 1918 года ў Менску браты Луцкевічы прымаюць удзел у гістарычным Акце абвяшчэння Беларускай

Народнай Рэспублікі. [7, с. 112] На Беларускай канферэнцыі 1918 г. А. Луцкевіч быў абраны старшынёй Віленская беларускай рады. 18 сакавіка 1918 г. ён быў кааптаваны ў склад Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. У верасні 1918 г. А. Луцкевіч быў прызначаны Радай БНР Старшынёй Народнага Сакратарыята і народным сакратаром замежных спраў. Да жніўня 1919 г. А. Луцкевіч выязджаў у Гродна, Берлін і Парыж на “Мірную канферэнцыю”.

У 1918-1919 гадах І. Луцкевіч дабіваўся дазволу на адкрыццё Віленскай Беларускай гімназіі ў Базыльянскіх мурах па Вострабрамскай вуліцы, 9. І. Луцкевіч прыняў актыўны удзел у арганізатарскай працы ініцыятыўнай групы беларускіх настаўнікаў, у склад якой ўвайшлі І. Станкевіч, М. Кахановіч, А. Сакалова, Ю. Мэнке, А. Чарняўская. На адкрыцці гімназіі 1 лютага 1919 года І. Луцкевіч, нягледзячы на свой дрэнны стан здароўя, правёў першую лекцыю-прамову, якой “сваім запалам і любоўю да Бацькаўшчыны захапіў і настаўнікаў, і вучняў”. [7, с. 122] Ён некаторы час працаваў выкладчыкам беларусазнаўства і краезнаўства у гімназіі. Адначасова І. Луцкевіч з’яўляўся сябрам калегіі выяўленчых мастацтваў пры камісарыяце асветы, чыім абавязкам была ахова помнікаў, арганізацыя музеяў і мастацкіх школ.

### 2.3. Збіральніцкая праца і стварэнне музейнай калекцыі

Ужо з трэцяга класа ў Лібаўскай Мікалаеўскай гімназіі Іван Луцкевіч пачаў збіраць манеты і розныя старасвецкія рэчы, што было абумоўлена яго вялікай цікаўнасцю да гісторыі і старасвеччыны. [25, с. 3] У класе ён быў першы ў веданні гісторыі. Такой зацікаўленасці Івана Луцкевіча спрыяла наяўнасць добрага настаўніка і кіраўніка ў асобе вучыцеля гісторыі і геаграфіі Шэна. І. Луцкевіч шмат часу пасвячаў чытанню, ён добра вучыўся і ўвесь вольны час аддаваў збіранню старажытных рэчаў.

У Менску цікавасць да даўніны І. Луцкевіча ўмацавалася пад уплывам менскага археолага-аматара, вядомага знаўцы беларускіх старажытнасцяў Г. Х. Татура. Пад яго кіраўніцтвам Іван стварае і ўзбагачае сваю калекцыю. Гэтае знаемства стала дадатковым штуршком да заняткаў археалогіяй і гісторыяй свайго краю і стымулам да паступлення ў Археалагічны інстытут у Пецярбурзе.

Збор І. Луцкевіча ў перыяд навучання ў Пецярбурзе на юрыдычным факультэце і адначасова ў археалагічным інстытуце ўвесь час папаўняўся ў выніку археалагічных раскопак, шматлікіх этнаграфічных вандровак, кантактаў з іншымі калекцыянерамі.

У 1903 годзе І. Луцкевіч пачынае выдавецтва літаграфованай аднаднёўкі “Калядная пісанка”, збіранне і падрыхтоўку да друку пасмертнай спадчыны Я. Лучыны ў зборніку пад загалоўкам “Вязанка”, прыцягвае да літаратурнай працы аднаго з першых сваіх супрацоўнікаў К. Каганца, вышуквае старыя беларускія творы, якія знаходзяцца ў людзей ў рукапісах. [31, с. 8]

У 1904 годзе І. Луцкевіч закончыў Археалагічны інстытут і атрымаў камандзіроўку для навуковых доследаў пра Беларусь і для далейшай навукі ў Вену. У Вене ён вучыўся ў “Славянскім семінары” пры універсітэце пад кіраўніцтвам прафесара Ягіча. У перыяд камандзіроўкі І. Луцкевіч паглыбляе свае веды па гісторыі і здабывае экспанаты для сваёй калекцыі. У Вене, завязаўшы знаёмства з украінцамі, ён надрукаваў свой першы артыкул “Das totdesagte Weissrussland” (“На смерць асуджаная Беларусь”) аб беларусах і беларускай справе ў часопісе “Ruthenische Revue”. Вяртаючыся з Вены, І. Луцкевіч заехаў ў галоўны цэнтр украінскага руху, Львоў, дзе пазнаёміўся з уніяцкім мітрапалітам Шэптыцкім. Іх інтарэсы аб’ядноўваліся на грунце археалогіі і пытанні аб уніі. У Львове, Кракаве і Варшаве І. Луцкевіч таксама пазнаёміўся і з польскімі вучонымі-гісторыкамі і археолагамі.

І. Луцкевіч шмат ведаў пра беларускую культуру і мастацтва. Трэба адзначыць, што ён не толькі сам шмат ведаў, але ўмеў і другіх заахвоціць і далучыць да справы на ніве беларускага Адраджэння. Тут можна прыгадаць словы Ю. Вітан-Дубейкаўскай у яе ўспамінах: “Я навучылася цаніць у ім яго ідэйную ахвярную працу для дабра свайго народу, яго выдатную веду і спрыт.” [7, с. 31] Асноўнай сферай яго дзейнасці было збіральніцтва і даследванне беларускіх старажытнасцей. І. Луцкевіч спрыяў ажыўленню культурна-асветніцкай працы, абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці вучнёўскай і студэнцкай моладзі, беларускай інтэлігенцыі. Аб гэтым сведчыць выкладанне І. Луцкевіча ў Віленскай беларускай гімназіі беларусазнаўства і краязнаўства.

Ад самага пачатку выхаду “Нашай Нівы” калекцыя І. Луцкевіча перахоўвалася ў памяшканні рэдакцыі газеты на вул. Завальнай, 7. Ужо тады калекцыя выконвала важную ролю, прапагандуючы гісторыю Беларусі сярод перадавой беларускай інтэлігенцыі, натхняла пісьменнікаў, што гуртаваліся вакол газеты. Многія творы Я. Купалы былі навеяны памяткамі мінуўшчыны, што знаходзіліся ў калекцыі І. Луцкевіча. М. Багдановіч пасля знаемства з калекцыяй напісаў цэлы шэраг вершаў “Старая Беларусь”, якія былі змешчаны ў зборніку “Вянок”. З. Бядуля так адазваўся аб калекцыі ў сваім эсэ “Святое гэта месца!..”, прысвечаным І. Луцкевічу: “Багата наша будучыня! Багаты наш беларускі народ! Многа шчырых сыноў ёсць на зямельцы яго! Святое гэта месца, бо яно родзіць зярняты прасветы для ўсяго вялікага Беларускага народу!”. [31, с. 55] Можна сцвярджаць, што гэтым быў зроблены першы крок да агульнадаступнага беларускага музея. Увосень 1912 г. на старонках “Нашай нівы” быў зроблены заклік да стварэння беларускага музея. [13, с. 67]

У чэрвені 1908 года І. Луцкевіч прымаў удзел ва Агульнаславянскім з'ездзе “прагрэсіўных студэнтаў” у Празе. Там ён кіраваў беларускай секцыяй і ў сваіх выступленнях абараняў правы беларусаў на беларускую адукацыю і культуру: “Беларусы ў Празе былі яшчэ

500 гадоў таму. Тады ў іх была багатая літаратура. У самой Празе яны надрукавалі па-беларуску Біблію. Па беларуску-ж надрукованы быў і Статут Літоўскі. Цяпер прайшло з таго часу 500 гадоў, і пра беларусаў ніхто не знае: чыноўніцкая і панская гаспадарка зрабілі тое, шо няма не толькі ніводнай сярэдняй, але ніводнай ніжэйшай народнай школы, дзе вучылі б па-беларуску!” [31, с. 15]

І. Луцкевіч прыкладаў усе намаганні дзеля здабывання экспанатаў для сваёй калекцыі. У біяграфічным нарысе падаецца такі факт: “Даведаўшыся, што ў Кракаве ў аднаго з лідэраў ППС Іодкі ёсць надрукаваны па-беларуску Літоўскі Статут, І. Луцкевіч нелегальна пераўшоў граніцу і так жа нелегальна вярнуўся са Статутам.” [22, с. 15] У калекцыянерскай працы яму многа дапамагала здольнасць лёгка знаёміцца з людзьмі, тактоўнасць і глыбокая эрудыцыя.

Пошукі збіральніка І. Луцкевіча шмат дапамагалі даследчыкам, хаця сам ён пісаў мала. Як адзначае Ю. Вітан-Дубейкаўская, І. Луцкевіч не любіў пяра: “ягоныя думкі плылі гэтак хутка, што пяро не паспявала за імі, але ён меў дар слова і ўмеў захапіць слухачоў”. [7, с. 34] І. Луцкевіч часам рабіў накіды артыкулаў, а А. Луцкевіч іх апрацоўваў. Гэтыя артыкулы звычайна падпісваліся псеўданімам “Іван Мялешка”, напрыклад, у газеце “Гоман”. Ва ўспамінах Ю. Вітан-Дубейкаўская параўноўвае братоў Луцкевічаў: “Іван усім кіраваў, а Антон рабіў усю пісьмовую працу, меў хуткае пяро і добры стыль. Як і Іван, Антон быў адданы беларускай працы. Але ў яго характары не было той энергіі, таго палёту і ўздыму, хоць быў вельмі амбітны, як у Івана: Антон не ўмеў так пазнацца на людзях, ці гэтак іх заахвоціць да працы, як гэта рабіў Іван, аднак і Антон быў добры, сумленны працаўнік беларускай справы, але нажаль, не меў кіраўнічых уздальненняў і пачуцця ў палітыцы. Але, працуючы разам, браты Луцкевічы дапаўнялі адзін аднаго.” Прыклад братоў Луцкевічаў з’яўляецца выключным у гісторыі беларускага адраджэнскага руха.

Нягледзячы на савецкую крытыку ў нацыяналізме ў адрас І. Луцкевіча, ён, як бачна, быў вольны ад нацыяналізму ў галіне навукі і культуры. Ён пастаянна супрацоўнічаў з польскімі, яўрэйскімі, расейскімі і іншымі замежнымі вучонымі, абменьваўся вынікамі сваіх навуковых даследаў. І. Луцкевіч ахвотна ўступаў другім тыя рэчы, якіх сам не мог спецыяльна збіраць, або якія пры тагачасных варунках не маглі быць выкарыстаны дзеля беларускага музея, але мелі вагу для іншых калекцый. Вялікую помач ён аказаў Украінскаму Царкоўнаму музею ў Львове, заснаванаму мітрапалітам Шэптыцкім, пасылаючы багата памятак Уніі і ладзячы там асобны беларускі аддзел. Вынікі сваіх даследаў і выкрытыя цікавыя факты і матэрыялы ён ахвотна публікаваў у чужых навуковых органах, калі яны цікавілі народ іх выдаўцоў: аб літвінах – у “Lietuviu Tauta”, аб паляках – у выданні “Rocznik Towarzystwa Przyjaciol Nauk w Wilnie”. [31, с. 16]

І. Луцкевіч часта выступаў з лекцыямі, рэфератамі, а ў апошнія гады перад першай сусветнай вайной выкладаў гісторыю мастацтва ў артыстычнай школе Рыбакова ў Вільні.

Ёсць асобныя публікацыі ў розных беларускіх, расейскіх, польскіх і літоўскіх перыядычных выданнях. У якасці прыкладу публікацый І. Луцкевіча можна прывесці наступныя: “Аб беларускім мастацтве”, дзе разглядаецца старабеларуская выяўленчая школа “рыцця па золаце”, апісанне рукапіса “Аль-Кітаб”, які быў знойдзены І. Луцкевічам ў 1915 г. У артыкуле “На смерць асуджаная Беларусь”, надрукаванага ў 1904 г. у венскім нямецкамоўным часопісе “Ruthenische Revue”, - фактычна першай ў XX ст. на заходнебеларускім абшары навуковай публікацыі пра Беларусь, - І.Луцкевіч даў сціслы агляд гісторыі і культуры Беларусі. [21, с. 44]

Сярод гісторыка-культуразнаўчых, археалагічных нататкаў, допісаў І. Луцкевіча можна выдзяліць незавершаны артыкул “Жменя слоў пра Белую Русь, яе гісторыю, літаратуру” (пра праблемы станаўлення і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці на працягу XII – XVI стст. у кантэксце палітычнага процістаяння націскам з боку Польшчы і Маскоўскай Русі), палявы дзённік Луцкевіча-археолага, нататку “Старажытная Вільня”, у якой пастаўлена праблема вывучэння культурных пластоў горада. На сенняшні дзень адсутнічае бібліяграфія работ І. Луцкевіча па гісторыі і археалогіі.

І. Луцкевіч стварыў ў Вільні Беларускае навуковае таварыства і кіраваў гэтай арганізацыяй, паступова перадаючы Таварыству свае зборы. Асноўнай мэтай стварэння таварыства была арганізацыя ў ім музея ў будучым. А. Луцкевіч, як значыцца ў Гадавіку, з’яўляўся толькі кандыдатам Надзорчай Рады, аднак на справе прымаў значны ўдзел у працы Ураду и старшынстваваў на многіх паседжаннях Ураду. Падчас нямецкай акупацыі на іх разглядаліся наступныя пытанні: арганізацыя выставак, апрацоўка і перагляд школьных падручнікаў.

Вялікае значэнне мела праца І. Луцкевіча ў пашырэнні ведаў пра беларускае мастацтва, культуру, гісторыю і этнаграфію сярод прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, найперш за ўсё сярод немцаў у перыяд нямецкай акупацыі Вільні. І. Луцкевіч меў кантакты з археолагам з Берліну д-рам Іппэлем, палкоўнікам Штапфам з Веймарскага музею, прафесарам Вэберам, прафесарам афрыканскіх моваў доктарам Карлам Мэйнгофам, бібліятэкарам Берлінскай Імператарскай бібліятэкі Германам Пікам. Дзякуючы І. Луцкевічу яны сістэматычна і планава працавалі над беларускім мастацтвам. Да І. Луцкевіча, каб пачуць мову ад беларусаў, прыязджалі вучні прафесара Р. Абіхта з Брэслава. Нямецкія працы аб беларускім краі былі створаны на аснове інфармацыі, прадастаўленай І. Луцкевічам.

І. Луцкевіч ініцыяваў арганізацыі выстаў у Вільні ў маі 1918 года і ў Менску ўвосені таго ж года пры удзеле і пад афіцыйным кіраўніцтвам палкоўніка Штапфа і доктара Іппэля. [11, с. 6] На гэтых выставах ён паказваў частку сваіх збораў і рэчы розных іншых асобаў, - усё гэта разам даводзіла, якую ролю іграў беларускі народ у гісторыі ВКЛ, якія багатыя скарбы культуры і мастацтва ён прыдбаў і пераказаў патомным пакаленням у друкаваным слове, граматах і праўных актах, у мастацкіх вырабах – малюнках, тканінах і іншых рэчах. З Магілёва І. Луцкевіч прывёз на менскую выстаўку з пазвалення Магілёўскага архіепіскапа Канстанціна каштоўныя экземпляры старабеларускага пісьменства, якія захоўваліся ў Царкоўна-гістарычным музеі. [31, с. 48]

На першай краёвай выставе хатніх промыслаў і народнага мастацтва літоўска-беларускіх губерняў у Вільні рэчы, пададзеныя “Нашай Нівай” і выдавецкай суполкай “Загляне сонца і ў наша ваконца”, былі згрупаваны І. Луцкевічам у асобны аддзел, які адразу ж атрымаў станоўчую ацэнку краёвай прэсы. Поспех яго засведчыў таксама малы залаты медаль аргкамітэта “За збор строяў і мастацкіх рэчаў беларускага народа”. Варта адзначыць, што аб’явы пра адкрыццё выставы, анатацыі да экспанатаў былі надрукаваны на чатырох мовах, у тым ліку і на беларускай.

Выстава ў Менску, як сведчыць, Ю. Вітан-Дубейкаўская, была багацейшая за віленскую, бо туды былі адпраўлены найлепшыя рэчы з віленскай выставы і выстаўлены прадметы, сабраныя І. Луцкевічам падчас вандровак па Беларусі паміж гэтымі двумя выставамі з мэтай заклікання усіх да беларускай працы, пошуку і ратавання памятак мінуўшчыны для музею і выставы. [7, с. 116]

І. Луцкевіч дапамагаў і іншым народам у стварэнні сваіх нацыянальных музеяў. Так ён удзельнічаў у стварэнні уніяцкага аддзела ў Львоўскім царкоўна-археалагічным музеі, музеяў Таварыства аматараў яўрэйскіх старажытнасцяў і польскага Таварыства аматараў навук у Вільні.

На паседжанні Ураду 13 мая 1918 года І. Луцкевіч афіцыйна перадаў Беларускаму Навуковаму Таварыству сваю калекцыю. [11, с. 6] Аднак Таварыства на той час не мела матэрыяльных сродкаў для перахавання і сістэматызавання калекцыі, таму рэчы засталіся ў кватэры Луцкевічаў у Вільні.

Сход сяброў Таварыства, які адбыўся 3 красавіка 1919 года, быў выкліканы тым, што літоўскія дзеячы доктар Басановіч і Нагевіч выступілі перад бальшавіцкімі ўладамі з мэтай засеквестравання музея і бібліятэкі таварыства, каб тыя пасля ўвайшлі ў склад праектаванага дзяржаўнага музея Савецкай Літвы. Паседжанне таварыства выпрацавала мемарыял-пратэст. Там жа была прынята рэзалюцыя аб тым, каб беларускія навуковыя арганізацыі ў Менску і

Вільні ўзялі пад сваю ахову помнікі старасвеччыны. У гэты час, як відаць з заявы І. Луцкевіча Камісару Народнай Асветы ад 17 студзеня 1919 года № 209, Таварыства атрымала бібліятэку-чытальню “Веды” Б. Даніловіча. [11, с. 9]

У чэрвені І. Луцкевіч выехаў на лячэнне ў Закапанае ў Польшчу. Там 20 жніўня 1919 г. ён памёр. [22, с. 17] Спачатку І. Луцкевіч быў пахаваны ў Польшчы, а затым сімвалічна перапахаваны ў Вільні на могілках Росы.

Каўка зазначае прынцыпова адметны змест, унесены І. Луцкевічам у музейнае буданіцтва, а менавіта перавод гэтай справы з рэек рэгіянальнага (краёвага) і прыватнага калекцыянавання папярэднікаў (братоў Тышкевічаў, Г. Татура, І. Каладзеева, А. Ельскага) на ўласна беларускія, агульнаграмадскія падваліны. Адсюль і нацыянальна-абуджальнае значэнне музейных збораў І. Луцкевіча, падцверджанае творчым вопытам многіх беларускіх адраджэнцаў – ад М. Багдановіча да М. Танка. Словы ўдзячнасці, выказаныя Л. Родзевічам, адным з духоўных гадунцоў заснавальніка музея, пасведчылі гэтае значэнне: “Адкапалі, пане археолагу, сваёй шчырай працай, адкапалі праўду Беларусі, абаранілі ад руўнуючага часу, ад шкоднай паняверы, здзеку”. [21, с. 43]

Такім чынам, культурніцкая дзейнасць І. Луцкевіча спрыяла пашырэнню асветы сярод беларускага насельніцтва і ведаў пра гісторыю і мастацтва Беларусі сярод іншых народаў. Музейная дзейнасць мела вялікае значэнне не толькі для Адраджэння Беларусі ўвогуле, але і для развіцця музейнай справы на Беларусі. І. Луцкевіч не здолеў арганізаваць музей у навуковую ўстанову, аднак ён зрабіў значны крок дзеля гэтага, сабраўшы за сваё жыццё значную калекцыю для арганізацыі такога музея.

### 2.4. Дзейнасць А. Луцкевіча ў міжваенны час. Стварэнне музея

У 1920 г. А. Луцкевіч зрабіў спробу аднавіць “Нашу Ніву”, спярша ў постаці зборніка, а потым тыднёвіка. Было выпушчана 9 нумароў. [27, с. 204] Да канца 1920 года А. Луцкевіч склаў і выдаў зборнікі “Наша Ніва” і “Памяці Івана Луцкевіча”.

Што датычыцца палітычнай дзейнасці А. Луцкевіча ў гэты перыяд, то ў 1922 годзе ён стаяў на чале Цэнтральнага Беларускага выбарчага камітэта ў польскі сейм. У 1923 годзе ён далучыўся да беларускага Пасольскага клуба, галоўнай мэтай дзейнасці якога было дасягненне незалежнасці для Беларусі. Пасля яго расколу А. Луцкевіч да 1927 года працаваў у беларускай “Грамадзе”, быў тэхнічным рэдактарам яе газет. [2, с. 90]

Асноўнай задачай, якая вырашалася на Агульным сходзе Беларускага Навуковага Таварыства 13 красавіка 1924 года, на якім старшынстваваў А. Луцкевіч, была абарона Віленскага беларускага музея і іншых беларускіх навуковых устаноў, змешчаных у

Базыльянскіх мурах, ад пагрозы эксмісіі. Было пастаноўлена звярнуцца да Беларускага Нацыянальнага Камітэту з мэтай наладжвання супольнай акцыі абароны Базыльянскіх муроў. Таксама на сходзе было пастаўлена пытанне аб здабыцці ўласнага будынку для музея. Аднак, гэтыя справы так і не былі вырашаны. Справу куплі будынку для Беларускага музея не ўдалося пераўтварыць у жыццё з-за нястачы грошай.

Беларускае Навуковае Таварыства працягвала справу І. Луцкевіча і збірала рэчы для музея. Так, на паседжанні таварыства 20 жніўня 1924 года было пастаноўлена звярнуцца да праваслаўных і каталіцкіх святароў, настаўнікаў і беларускай інтэлігенцыі з просьбай пашукаць у старых цэрквах, касцёлах, архівах беларускіх кніг, грамат і іншых здабыткаў. [11, с. 12]

А. Луцкевіч з даручэння Беларускага Навуковага Таварыства напісаў пра вынікі камісійных і сваіх уласных прац у справе гэтак званай “Celi Konrada” ў Базыльянскіх мурах на польскай мове ў асобнай брашуры і на беларускай у зборніку “Заходняя Беларусь”, які выйшаў у Вільні ў 1924 годзе. [11, с. 11]

З 1920 да 1927 г. А. Луцкевіч выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі беларускую літаратуру, перакладаў падручнікі, складаў навучальныя праграмы. А. Луцкевіч апублікаваў шэраг прац па гісторыі беларускай культуры, мастацтва і літаратуры. Ён пісаў пра Адраджэнне беларускага мастацтва, пра яго даследчыкаў і пра неабходнасць вярнуць у Беларусь культурную спадчыну. Таксама А. Луцкевіч чытаў публічныя лекцыі, перш за усё для вучняў Віленскай беларускай гімназіі. Так у газеце “Голас Беларуса” змяшчаюцца аб’явы пра лекцыі А. Луцкевіча “Аб беларускай драме” 17 лютага 1924 года, “Эвалюцыя беларускай адраджэнскай ідэалогіі і адбіццё яе ў літаратуры” 24 студзеня 1926 года, пра правядзенне літаратурнага суда над героем з повесці М. Гарэцкага Абдзіраловічам вучнямі Віленскай беларускай гімназіі пад кіраўніцтвам А. Луцкевіча. Такім чынам, А. Луцкевіч навучаў вучняў думаць самастойна і крытычна і выпрацоўваць свой уласны светапогляд.

У ліпені 1921 г. А. Луцкевіч заснаваў Беларускую школьную раду, якая пазней злілася з Таварыствам беларускай школы. Такім чынам, ён спрыяў пашырэнню асветы і адукацыі сярод беларускага насельніцтва.

У 1921 годзе ўся калекцыя І. Луцкевіча была перавезена ў Базыльянскія муры па Вастрабрамскай вул. 9, дзе праваслаўнае духавенства, якое было тагачасным уладальнікам будынку, выдзяліла бясплатна памяшканне для арганізацыі ў ім музея. [25, с. 3] З гэтага часу музей пачынае дзейнічаць як навукова арганізаваная ўстанова.

У гэтым жа годзе да музейнай калекцыі І. Луцкевіча былі далучаны кнігі і архіўныя матэрыялы Е. Р. Раманава, якія ад знішчэння ўратаваў старшыня Ураду К. Шафнагель.

У Базыльянскіх мурах па вуліцы Вастрабрамскай 9, акрамя Віленскага беларускага музея, знаходзіліся Віленская беларуская гімназія і Беларускі прытулак. Пасярэдзіне дома стаяў Траецкі манастыр. Беларускі музея імя І. Луцкевіча знаходзіўся ў левым крыле будынку на першым паверсе. Плошча памяшкання музея была толькі 198 кв. метраў, што было мала і таму не хапала месца для экспанавання ўсіх значных рэчаў. Экспанаваліся найбольш каштоўныя і цікавыя экспанаты. Музей утрымліваўся коштам ахвярнага беларускага грамадзянства і з сяброўскіх узносаў Беларускага Навуковага Таварыства.

А. Луцкевіч да свайго арышту 30 верасня 1939 г. быў дырэктарам Беларускага музея. Дзеля ўшанавання памяці збіральніка калекцыі І. Луцкевіча Беларускае Навуковае Таварыства назвала музей “Віленскі беларускі гісторыка-этнаграфічны музей імя Івана Луцкевіча”. Акрамя А. Луцкевіча ў склад Музейнай Рады, якая працавала як секцыя Беларускага Навуковага Таварыства ўваходзілі бібліятэкар У. Самойла, скарбнік Таварыства А. Неканда-Трэпка, мастацкія работы выконваў беларускі графік і жывапісец Я. Драздовіч. Значны аб’ём менш кваліфікаваных работ у музеі выконвалі вучні Віленскай беларускай гімназіі. Трэба адзначыць, што гэтыя дабраахвотнікі не мелі спецыяльнай падрыхтоўкі ў галіне матэрыяльнай культуры і музеязнаўства.

Паводле слоў Змітрака Бядулі, музей стаў Мекай не толькі для жыхароў беларускай нацыянальнасці Заходняй Беларусі, але і для беларусаў, што знаходзіліся па-за яе межамі, а таксама для прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў, што цікавіліся і вывучалі беларускую праблему. [47, с. 33] Музей ствараў у наведвальнікаў патрэбу шукаць сляды продкаў, сляды багатай спадчыны мінулых пакаленняў беларускага народу, шукаць прадметнае і праўдзівае сведчанне аб яго культуры і інтэлектуальным развіцці. Музей змяшчаў скарбы духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народу, прадметныя сведчанні аб яго творчай і самабытнай нацыянальнай індывідуальнасці.

Асноўнай мэтай існавання музея было не проста знаёмства з гісторыяй, культурай і мастацтвам Беларусі і беларускага народа, а патрыятычнае ўздзеянне на наведвальніка і выклік ў яго жадання дзейнічаць на ніве беларускага Адраджэння. Як зазначае Я. Шутовіч, “музей у некаторай ступені стаў сапраўдным беларускім нацыянальным музеем”. [47, с. 33]

Стварыўшы на аснове калекцый І. Луцкевіча і бібліятэкі “Веды” Б. Даніловіча Беларускі музей імя І. Луцкевіча, А. Луцкевіч неадменна стаяў на яго чале амаль 18 гадоў. Сюды ен прыносіў рукапісы Цёткі, У. Жылкі, Н. Арсеньевай. А. Луцкевіч узначальваў Беларускі музей імя І. Луцкевіча і парадкаваў яго фонды. Ён выконваў абавязкі загадчыка і адначасова старшыні таварыства. Само памяшканне Базыльянскіх муроў было даведзена да належнага стану коштам А. Луцкевіча і Л. Дубейкоўскага.

Такім чынам, праца па сістэматызаванню і ўпарадкаванню калекцыі была распачата Беларускім Навуковым Таварыствам, у прыватнасці А. Луцкевічам, пасля 1921 году. Музей сфармаваў аддзелы дагістарычны, этнаграфічны, побытавы, рукапісаў і друкаў. Фонды музея папаўняліся штогод. Новыя паступленні міжваеннага часу складаліся з закупак, перадачы з розных арганізацый, з ахвяраванняў прыватных асоб. Аднак, як зазначае А. Луцкевіч, лічба гэтых экспанатаў была адносна невялікая, калі параўнаць з калекцыяй І. Луцкевіча. Характар збору быў такім жа самым як і пры І. Луцкевічу. А Луцкевіч адзначае, што за гэты час значна ўзбагаціліся аддзел архіўных матэрыялаў ваенных і пасляваенных часоў да 30-х гг. XX ст., бібліятэка друкамі на беларускай мове і працамі па беларусазнаўству, кнігамі І. Луцкевіча (пераважна страдрукамі), часткай бібліятэкі Е. Р. Раманава, кнігазборам Б. Даніловіча, прадметамі з Наваградчыны (зброяй, партрэтамі). [25, с. 3]

А. Луцкевіч стаяў на чале Віленскага Беларускага музея імя І. Луцкевіча на працягу 20 гадоў. Менавіта яго праца, на думку М. Пецюкевіча, захавала бясцэнныя музейныя экспанаты ад нішчэння. [32, с. 82] Паралельна з працай у музеі А. Луцкевіч знаходзіў час на дыдактычную працу ў Віленскай беларускай гімназіі, на грамадскую працу ў Беларускім Навуковым Таварыстве і ў розных беларускіх арганізацыях. Ён быў таксама журналістам, палітычным і культурным дзеячам Заходняй Беларусі. А. Луцкевіч праз друк папулярызаваў беларускую справу на міжнароднай арэне.

У газеце ”Голас Беларуса” ад 14 лютага 1924 года ёсць заметка пра наведванне Віленскай беларускай гімназіі і Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча польскім сенатарам Кржыжаноўскім і пасламі Вяндзягольскім і Плаўскім, з мэтай бліжэйшага знаёмства з палажэннем беларускіх культурных устаноў і беларускай школьнай справы. Як гаворыцца ў артыкуле: “Госці вынеслі добрае ўражанне ад беларускіх культурных устаноў, і як кажуць самі, гэта іх яшчэ больш пераканала ў патрэбе неадкладнага задавальнення дамаганняў беларускага грамадзянства ў справе беларускай асветы”. [43, с. 4]

Аднак, нягледзячы на такі аптымістычны артыкул у першым нумары газеты “Голас Беларуса”, у той жа газеце ад 29 лютага 1924 года змяшчаецца заметка аб спробе “выкідання музея” з Базыльянскіх муроў. [44, с. 4] Беларускае Навуковае Таварыства атрымала ад дэлегата Урада афіцыйнае паведамленне, у якім музей патрабуюць вызваліць памяшканне ў Базыльянскіх мурах. Такім чынам, у міжваенны перыяд для існавання музея былі розныя перашкоды. Аднак, нягледзячы на гэта, музей здолей праіснаваць 24 гады, і вялікая заслуга ў гэтым належыць А. Луцкевічу.

Беларускае Навуковае Таварыства і А. Луцкевіч, ў прыватнасці, правялі рамонт і прыспасабленне пад музей памяшканне ў Базыльянскіх мурах. Даступнымі для агляду ў той час

была частка старых тканін, сабранне абразоў, зброі, народных вырабаў і бібліятэка. Калекцыі манет, грамат і багаты архіў не маглі быць паказаны, бо не хапала матэрыяльных сродкаў. Як адзначалася ў газеце "Голас Беларуса", музей не мог быць адчынены дзеля публічнага ўжытку з прычыны адсутнасці шкляных шаф і вітрын, каб раскласці вельмі багатыя памяткі мінуўшчыны, і, нягледзячы на каштоўны навуковы матэрыял, Беларускае Навуковае Таварыства не магло яго надрукаваць. [45, с. 4]

Калекцыя Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча ўвесь час папаўнялася, у тым ліку і за кошт падарункаў музею. Так, у газеце "Беларуская Ніва" змяшчаецца падзяка за прысланыя для музею рэчы: "Мікалаю Кабяку з вёскі Басянкі Дзісненскага павета – за 5 манет, настаўніку Астапчыку – за 1 медную манету, вучню Віленскай беларускай гімназіі – за 1 манету. [41, с. 3]

10 студзеня 1927 года на паседжанні Урада Беларускага Навуковага Таварыства па прапанове А. Луцкевіча было вырашана ўтварыць сталую Музейную Раду дзеля адміністрацыйнага і фінансавага кіраўніцтва музеем. У склад Музейнай Рады, дзеючай на правах секцыі, былі выбраны: А. Луцкевіч, Б. Тарашкевіч і А. Трэпка. Аднак у гэтым складзе яна ні разу не сабралася, бо 15 студзеня Б. Тарашкевіч быў арыштаваны. [11, с. 13]

У 1929 годзе Беларускім Навуковым Таварыствам было арганізавана святкаванне 400-годдзя Літоўскага Статуту. З рэфератам выступаў А. Луцкевіч. [11, с. 14]

У 1930-я гг. ён адышоў ад палітычнай дзейнасці, працаваў у Беларускім навуковым таварыстве і Беларускім музеі, выступаў з лекцыямі і рэфератамі.

У 1930 годзе Урад Беларускага Навуковага Таварыства арганізаваў Краязнаўча-турыстычную секцыю пад старшынствам М. Ільяшэвіча. Галоўным і значным вынікам яе дзейнасці была арганізацыя вясной 1930 года выставы малюнкаў, абразоў і фотаздымкаў беларускіх тыпаў, народнай вопраткі, тканін і будоўлі наступных мастакоў: Я. Драздовіча, П. Сергіевіча і У. Грыневіча. Я. Драздовіч прадставіў на выставе багаты збор малюнкаў і зарысовак, які пасля быў набыты А. Луцкевічам для Віленскага Беларускага музея. П. Сергіевіч выстаўляў абразы, а У. Грыневіч – фатаграфіі. Выстава працягвалася 2 дні і налічыла звыш 300 наведвальнікаў. [11, с. 15]

Дзейнасць музея ажывілася ў 1930-х гг., калі палепшылася яго матэрыяльнае становішча. У гэты час павялічалася грашовая дапамога з боку грамадства і дзяржавы. Як значыцца ў Гадавіку Беларускага Навуковага Таварыства, у 1930 - 1931 гадах, дзякуючы атрыманню невялікай штомесячнай дзяржаўнай дапамогі на ўтрыманне Музея ў ім была распачата больш інтэнсіўная праца. Пералічэнні аднаго старшыні Беларускага цэнтра ў Літве К. С. Дуж-Душэўскага з Коўна дазвалялі аплочваць працу ўсіх супрацоўнікаў. Памяшканні ў Базяльянскіх

мурах пераўтварыліся ў залы з разгорнутай сістэматычнай экспазіцыяй: быў зроблены рад шкляных шаф і вітрын, у якіх былі выстаўлены недаступныя раней дзеля агляду экспанаты. А. Луцкевічам і У. Самойлам вялася інвентарызацыя экспанатаў і каталагізацыя кніг у музейнай бібліятэцы. Да канца 1931 года было скаталагізавана каля 3000 кніг. У сувязі з гэтым ажывілася і наведванне музею, хаця, як пазначае А. Луцкевіч, музей яшчэ не мог быць адчынены для ўсіх. У 1931 і 1932 гадах яго наведала каля 500 чалавек і ў ім было праведзена некалькі дзесяткаў экскурсій. [11, с. 15] У Бібліятэцы пры музеі працавала шмат асобаў – пераважна студэнты Віленскага універсітэту, Інстытуту Палітычных Навук, Педагогіуму, якім патрэбен быў матэрыял для навуковых прац. Экскурсаводамі ў музеі ў асноўным працавалі студэнты.

Запісы з інвентарнай кнігі музея сведчаць аб тым, што А. Луцкевіч запрашаў спецыялістаў па археалогіі і другіх галінах ведаў з Польшчы, Францыі, Італіі, Бельгіі, Нямеччыны, Нарвегіі, Паўночнай Амерыкі, Швецыі, Гішпаніі для даследвання і навуковага выяснення паасобных экспанатаў. [15, с. 68]

У 1931 годзе дзяржаўная фінансавая дапамога музею была прыпынена і ўзноўлена толькі праз нейкі час, але ў значна зменшанай меры, што дазваляла толькі пакрываць выдаткі за памяшканне і камунальныя паслугі. [11, с. 16]

Пасля 1932 года музейная праца Таварыства стала для яго галоўнай. Ад лютага 1932 года новы Урад у складзе кіраўніка музея А. Луцкевіча, бібліятэкара У. Самойлы і дэлегата Ураду - скарбніка А. Трэпкі распачаўладжанне папулярна-навуковых лекцый, як публічных, так і бясплатных. Да лета адбылося толькі 10 лекцый, у далейшым арганізоўваць іх не ўдавалася па прычыне пераходу Віленскай Беларускай гімназіі ў рукі дзяржавы і адсутнасці памяшкання для правядзення лекцый. У канцы 1932 году Урад Беларускага Навуковага Таварыства аднавіў дзейнасць Турыстычна-краязнаўчай секцыі і арганізаваў працу гістарычнай і літаратурна-мастацкай секцый. [11, с. 16]

У Беларускім Навуковым Таварыстве ў 30-х гадах была ўтворана музейная секцыя, якая кіравала ўсёй працай Беларускага музею імя І. Луцкевіча. Экспанаты музея шырока прадстаўляліся беларускай і замежнай публіцы: музей абслужыў сваімі экспанатамі рад выставак: Славянскую выстаўку ў Рызе ў 1931 годзе, Міцкевічаўскую ў Наваградку ў 1932 г., выстаўку народнага мастацтва ў Варшаве (IPS) і Марыёлагічную выстаўку ў Вільні ў 1937 г., выстаўку “Палессе” ў Львове ў 1938 годзе. [15, с. 68]

У Запісах Беларускага Навуковага Таварыства змяшчаюцца звесткі пра колькасць наведвальнікаў Беларускага музея імя І. Луцкевіча і пра колькасць праведзеных экскурсій: у 1933 годзе – 1320 чалавек (48 экскурсій), у 1934 годзе – 920 чалавек (51 экскурсія), у 1935 годзе – 903 чалавека (42 экскурсіі), у 1936 годзе – 1494 чалавека (64 экскурсіі), у 1937 годзе –

4569 чалавек (110 экскурсій), за першыя чатыры месяцы 1938 года – 4000 чалавек (70 экскурсій). [15, с. 68] Гэтыя лічбы сведчаць аб пастаяннай працы музей, і ў прыватнасці А. Луцкевіча, у галіне больш сістэматычнага экспанавання прадметаў, каталагізацыі прадметаў і правядзення вялікай працы па прыцягненню наведвальнікаў у музей.

Літаратурная творчасць А. Луцкевіча вызначаецца беларусазнаўчымі публікацыямі ў польскіх выданнях, асабліва ў “Przegladzie Wilenskim”. У адным са сваіх артыкулаў А. Луцкевіч пісаў пра выстаўку тагачаснага беларускага народнага мастацтва ў Вільні, якая адбылася ў 1918 г. па ініцыятыве І. Луцкевіча. Таксама А. Луцкевіч выступаў ў газеце “Віленскі агляд”, часопісе “Калоссе”, “Гадавіку Беларускага навуковага таварыства”. У сваіх артыкулах і нататках А. Луцкевіч выказваўся за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа, асуджаў нацыяналізм, напрыклад, у артыкуле “Краёвае становішча” 1914 года. Ён склаў курсы лекцый па фанетыцы і этымалогіі: “Як правільна пісаць па-беларуску” 1917 года, “Беларускі правапіс” 1918 года. У 1928 годзе А. Луцкевіч выдаў працу “За дваццаць пяць гадоў (1903-1928)”, прысвечаную гісторыі Беларускай рэвалюцыйнай грамады і Беларускай сацыялістычнай грамады. Ён даследаваў гісторыю нарадавольніцкага руху, выступаў з дакладамі і рэфератамі па гэтай тэме. А. Луцкевіч вывучаў мову скарынаўскіх выданняў і першы Статут Вялікага княства Літоўскага: “Чатырохсотлецце першага кодэксу беларускага права” 1929 года, “Статут Вялікага княства Літоўскага на фоне эвалюцыі нацыянальных адносін у Беларусі” 1930 года. Ён быў аўтарам зборнікаў літаратурна-крытычных прац “Нашы песняры” 1918 года, “Адбітае жыццё” 1929 года. Шэраг прац ён апублікаваў па гісторыі беларускай культуры, мастацтва і літаратуры: “Пуцяводныя ідэі літаратуры”, “Жыдоўскае пытанне ў беларускай літаратуры” 1921 года, “Вязніца Адама Міцкевіча” 1923 года. Асобныя артыкулы і нататкі А. Луцкевіч прысвяціў жыццю і творчасці М. Багдановіча, А. Бурбіса, М. Гарэцкага, Ядвігіна Ш., Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Я. Купалы, Цёткі.

Грашовая дапамога ў суме 400 рублей у месяц, прызначаная на падтрыманне музея, у 1938 годзе была спынена польскімі дзяржаўнымі ўладамі пасля таго, як А. Луцкевіч адмовіўся ад аб’яднання літоўскага і беларускага музеяў у адзін рэгіянальны ўрадавы музей. А. Луцкевіч быў перакананы, што Беларускі музей мае характар нацыянальнага і ніколі не адмовіцца ад свайго беларускага імені. [2, с. 99]

У 1938 годзе ўлады, не знайшоўшы ніякіх фармальных падстаў, не рашыліся зачыніць музей, бо ён уваходзіў у саюз музеяў Польшчы, быў зарэгістрыраваны ў спісе музеяў, выданным Лігай Нацый. Яго ведалі навуковыя даследчыкі не толькі ў Вільні, але і за мяжой, адкуль прыязджалі з мэтай выкарыстання музейных экспанатаў і матэрыялаў для сваіх навуковых прац.

А. Луцкевіч быў арыштаваны НКУС БССР 30 верасня 1939 года ў Вільні і памешчаны ў Лукішскую турму. У кастрычніку таго ж года яго перавялі ў Вілейку. Праз паўтара месяца пасля арышту па патрабаванню наркама ўнатраных спраў БССР Л. Цанавога А. Луцкевіч быў пераведзены ў Мінскую турму, дзе да лета 1940 года ён перыядычна дапытваўся следчымі НКУС БССР. 8 жніўня 1940 года яму было прад'яўлена абвінаваўчае заключэнне. Аднак толькі 14 чэрвеня 1941 года яму быў вынесены прысуд – "Луцкевіча Антона Іванавіча за антысавецкую дзейнасць заключыць у працоўны лагер тэрмінам на восем год". Антон Луцкевіч загінуў у савецкім канцлагеры каля Разані ў 1942 годзе. [2, с. 7]

Такім чынам, браты Іван і Антон Луцкевічы зрабілі вялікі ўнёсак у беларускае нацыянальнае Адраджэнне пачатку XX ст. Яны абодва былі вядомымі палітычнымі і грамадскімі дзеячамі, якія садзейнічалі пашырэнню асветы сярод беларускага насельніцтва. Браты Луцкевічы з'яўляліся аднымі з пачынальнікаў і ідэйных кіраўнікоў беларускага культурна-асветніцкага, грамадска-палітычнага руху на пачатку XX ст.

У юнацтве на далейшую палітычную, грамадскую і культурніцкую дзейнасць братоў Луцкевічаў шмат у чым аказала ўплыў выхаванне ў сям'і, заняткі, настаўнікі і акружэнне ў школе, знаемства з рэвалюцыйнымі настроямі, знаемства ў Менску з археолагам-аматарам Г. Х. Татурам. Пры гэтым погляды і інтарэсы І. Луцкевіча аказалі значны ўплыў на далейшую дзейнасць А. Луцкевіча. Адукацыя ў Пецярбургу была прыдатная для разгортвання там беларускай грамадскай дзейнасці, што і пачалі рабіць браты Луцкевічы і што можа азнаменаваць пачатак беларускага Адраджэння ў іх дзейнасці. Збіральніцкая дзейнасць І. Луцкевіча праходзіла неадрыўна ад яго палітычных поглядаў і палітычнай дзейнасці, бо стварэнне беларускага нацыянальнага музея павінна было ў некаторай ступені служыць адукацыйным мэтам і адраджэнню незалежнасці края. На грунце палітычнай, навуковай і культурнай працы браты Луцкевічы актыўна супрацоўнічалі з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Яны прытрымліваліся краёвай ідэалогіі: культурны і палітычны рост беларускага народа цесна звязаны з уздымам усяго краю. Гэта ў значнай ступені адбілася на складзе музейных калекцый.

І. Луцкевіч быў чалавекам ідэі: усё сваё жыццё ён пасвяціў палітычнай, грамадскай і культурнай працы. Аднак, уся яна мела адну мэту: палітычнае і культурнае Адраджэнне беларускага народа. А адно немагчыма без другога. І. Луцкевіч быў самаадданым чалавекам: на першае месца ў жыцці ён ставіў справу служэння беларускаму народу: "Яго беларуская справа – усё, потым ягоны шляхецкі гонар, а затым ужо асабістае жыццё і шчасце". [7, с. 63] Зацікаўленасць І. Луцкевіча гісторыяй, археалогіяй, мастацтвам, калекцыянаваннем сталі падпарадкаваны ідэі нацыянальнага Адраджэння Беларусі.

Як дзеячы беларускага руху браты Луцкевічы выходзілі за межы этнакультурнага разумення беларускага руху, а таксама этнакультурнага бачання гісторыі, у тым ліку і беларускіх земляў.

Арганізацыя Беларускага музея была бы немагчымай без самаадданай археалагічнай і збіральніцкай дзейнасці І. Луцкевіча. Асноўнай мэтай збору калекцый вучонага і археолага І. Луцкевіча было вывучэнне і даследаванне матэрыяльнай і духоўнай культуры, гісторыі з часоў Вялікага Княства Літоўскага і мастацтва беларускага народа. Ён надзвычайна глыбока асэнсаваў прыналежнасць культурнай спадчыны свайму народу. Яго навуковая збіральніцкая дзейнасць падпарадкоўвалася той жа мэце, што і грамадская, - Адраджэнню Бацькаўшчыны. Яго збіральніцтва мела ясна вызначаны напрамак: на аснове праўдзівай гісторыі абгрунтаваць права беларускага народа на самавызначэнне. Дзейнасць самога музея падтрымлівалася працай і сродкамі А. Луцкевіча, які зрабіў значны ўклад у фармаванне музея ў навуковую і ўпарадкаваную ўстанову.

У Вільні менавіта І. і А. Луцкевічы стварылі цэнтр і асяродак беларускага Адраджэння сваёй актыўнай палітычнай і культурнай працай. Менавіта тады сабраная І. Луцкевічам калекцыя пачала выконваць важную ролю ў беларускім Адраджэнні, прапагандуючы гісторыю Беларусі. І. Луцкевіч унес у музейнае буданіцтва прынцыпова адметны змест, а менавіта пераход гэтай справы з рэек рэгіянальнага (краёвага) і прыватнага калекцыянавання папярэднікаў (братоў Тышкевічаў, Г. Татура, І. Каладзеева, А. Ельскага) на ўласна беларускія, агульнаграмадскія падваліны. Адсюль зыходзіць і нацыянальна-будзіцельскае значэнне музейных збораў І. Луцкевіча. Культурніцкая дзейнасць братоў А. і І. Луцкевічаў спрыяла пашырэнню асветы сярод беларускага насельніцтва і ведаў пра гісторыю і мастацтва Беларусі сярод іншых народаў. Музейная дзейнасць мела вялікае значэнне не толькі для Адраджэння Беларусі ўвогуле, але і для развіцця музейнай справы на Беларусі. І. Луцкевіч сабраў за сваё жыццё значную калекцыю для арганізацыі музея, а А. Луцкевіч зрабіў шмат дзеля стварэння на аснове гэтай калекцыі нацыянальнага беларускага музея і яго функцыянавання як навуковай установы. Паралельна з працай у музеі А. Луцкевіч знаходзіў час на дыдактычную працу ў Віленскай беларускай гімназіі, на грамадскую працу ў Беларускім Навуковым Таварыстве. Ён праз друк папулярызаваў беларускую справу на міжнароднай арэне.

# 3. ФОНДЫ БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ

## 3.1. Калекцыі Беларускага музея

Віленскі беларускі музей імя І. Луцкевіча меў вялікі ўплыў на духоўнае станаўленне і нацыянальную свядомасць беларусаў. З рэальнай, арганізаванай па прынцыпу любой падобнай установы ён ператварыўся ў сцяг нацыянальнай ідэі, стаў помнікам беларускаму Адраджэнню пачатку XX стагоддзя. Фонды Віленскага беларускага музея ўяўляюць вялікую цікаўнасць для даследчыкаў, так як яны захоўвалі прадметы, якія прадстаўляюць гісторыю беларусаў і іншых народаў. Пазнаёміўшыся з помнікамі беларускай гісторыі, якія былі ў зборы І. Луцкевіча, у асноўным з кірылаўскімі рукапісамі, старадрукаванымі кнігамі і граматамі, Максім Багдановіч усклікнуў: “Гэта і ёсць фундамент нашага адраджэння! Гэта і за тысячу гадоў будзе сведчыць аб нас!” [24, с. 5] Гэтыя словы можна аднесці і да ўсёй калекцыі Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча.

Пра склад фондаў музея мы пазнаём з анкеты-адказа 1937 года, запоўненай А. Луцкевічам і змешчанай у архіве новых актаў, матэрыялаў польскага Міністэрства асветы і вызнанняў у Варшаве ў фондзе 7006. Віленскі беларускі музей, дырэктарам якога ў той час быў А. Луцкевіч, атрымліваў праз Міністэрства ўрадавыя субсідыі і таму трымаў перад ім справаздачу. Анкета дазваляе больш падрабязна ўявіць, якія экспанаты меў музей і колькі ў ім было наведвальнікаў. Цікавым з’яўляецца адказ А. Луцкевіча на пытанне анкеты пра характар збору музея – “рэгіянальны і нацыянальны з тэрыторыі беларускіх земляў (перадваенных), якія знаходзяцца ў межах Вялікага княства Літоўскага”. Пазначана, што Музей мае інвентар з падзелам па калекцыях, вопісы ў якім зроблены па-беларуску. [23, с. 162]

Паводле адказаў А. Луцкевіча на анкету, на 1 студзеня 1937 г. у музеі налічвалася 4228 экспанатаў, з іх выстаўлена ў экспазіцыі 1511, у фондах знаходзілася 2711. Колькасць экспанатаў па калекцыях вызначалася наступным чынам: этнаграфія – 86, выяўленчае мастацтва – 161, скульптура – 65, мастацкія промыслы – 154, нумізматыка – 2492, археалогія – 184. У бібліятэцы налічвалася 10555 тамоў. У 1936 г. музей папоўніўся 169 экспанатамі, якія былі яму ахвяраваны. Персанал музея складаўся з 3 адзінак: захавальніка, бібліятэкара і аднаго практыканта. [34, с. 178]

Фонды музея мелі агульнагістарычны характар. Іх склад адлюстроўваў патрыятызм і зацікаўленасць І. Луцкевіча у гістарычным мінулым беларускай інтэлігенцыі і асвятляў розныя перыяды гісторыі Беларусі.

Збор І. Луцкевіча складаўся з наступных раздзелаў:

Археалогія (рэчы з курганных і іншых раскопак);

Нумізматыка;

Мастацтва (карціны, абразы, графіка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва);

Этнаграфія (адзенне, тканіны, хатнія вырабы, музычныя інструменты);

Зброя і рыштунак;

Бібліятэка (пераважна старадрукі і рукапісы).

### 3.1.1. Археалогія

Археалагічны аддзел музея складаўся з археалагічнай калекцыі, сфрагістычнай калекцыі са 103 пячатак, калекцыі пярсцёнкаў, манет, беларускага лубка віленскіх майстроў XVII - XIX стст. Археалагічная калекцыя складалася з 200 скаталагаваных экспанатаў. Гэта былі прадметы, знойдзеныя пры раскопках кургаnoў І. Луцкевічам, Я. Тышкевічам і іншымі асобамі. Сярод іх А. Луцкевіч адзначае рэчы, знойдзеныя пры раскопках у Барысаўшчыне (ваколіцы Полелееўкі) у 1876 г., выкапні Церабенева ў Дзісненшчыне 1893 - 1894 гг., выкапні Мядзельскай гм. Паўстаўскага павета, выкапні з ваколіц возера Нарач. Увогуле ўстаноўлена паходжанне экспанатаў з 18 паветаў: Віленскага, Вялейскага, Свянцянскага, Лідскага, Ашмянскага, Дзісненскага, Пастаўскага, Гарадзенскага, Наваградскага, Нясвіжскага, Менскага, Барысаўскага, Бабруйскага, Ігуменскага, Рагачоўскага, Чаускага, Сенненскага і Гомельскага. Калекцыя ўключала прадметы эпохі палеаліту, неаліту, бронзавага і жалезнага перыядаў, аздобы з серабра, бусы, урны ручной лепкі і станковай работы. [25, с. 4]

Сфрагістычная калекцыя складалася са 103 пячацей. А. Луцкевіч выдзяляе найстарэйшыя з іх, якія з’яўляюцца вельмі каштоўнымі памяткамі ўлады полацкіх князёў і старадаўняй беларускай дзяржаўнасці: пячаці на сыгнетах князёў Усяслава (XI ст.) і Барыса (XII ст.), пячаць Міндоўга, маемастычная пячаць Яна Сабескага, пячаці манашых ордэнаў, манастыроў, кравецкага цэху з часоў Стэфана Баторыя 1580 г., школ, войск Вялікага Княства Літоўскага, Галоўнага Трыбуналу Вялікага Княства Літоўскага, 17 уланскага палка з 1812 г., беларускіх адраджэнскіх арганізацый і ўстаноў грамадскага і дзяржаўнага характару, калекцыю персцянёў, часткова з выразанымі на іх пячаткамі. [25, с. 6] Пячаткі полацкіх князёў з’яўляюцца асабліва каштоўнымі, так як яны з’яўляюцца памяткамі гісторыі тых асобаў, хто іх па сабе пакінуў, і агульны лік памятак удзельнага перыяду наогул невялікі і абмяжоўваецца пераважна цэрквамі і царкоўнымі рэчамі. Пячаткі Полацкіх князёў былі куплены для калекцыі І. Луцкевіча ў Дзісне В. Ластоўскім у 1915 годзе. [11, с. 183] Цікаўнасць уяўляе герб, якім карысталіся Полацкія князі на сваіх пячацях, бо ён прадстаўляе мадыфікацыю кіеўскага герба.

Памяткай старой беларускай і беларуска-літоўскай дзяржаўнасці з’яўляецца і пячаць Міндаўга з Пагоняй пад каралеўскай каронай. Вывучэнню гэтай пячаці прысвечана праца доктара Басановіча, надрукаваная ў I кніге “Lietuviu Tauta” і ў расейскай брашуры “Печати короля Миндовга и великого князя Кейстута”, (Вільня, 1913 г.). [25, с. 6]

### 3.1.2. Нумізматыка

Калекцыя нумізматыкі заслугоўвае вялікай ўвагі дзякуючы багатаму збору манет Вялікага Княства Літоўскага і калекцыі медаляў, якая уключае рэдкі экзэмпляр медальёну XI - XII ст. - ”Змеявік”. [25, с. 6] Гэты бронзавы круглы медальён з’яўляецца цікавым сведкам суіснавання паганскай і хрысціянскай рэлігій, бо мае з аднаго боку паганскія эмблемы, а з другога – хрысціянскія.

### 3.1.3. Мастацтва

Сярод прадметаў рэлігійнага культу вызначалася калекцыя старадаўніх крыжоў ад XII ст., складняў, царкоўных апаратаў, антымінсаў, ікон і абразоў. А. Луцкевіч выдзяляе сакосы віленскіх мітрапалітаў XV і XVI стст., касцельныя апараты і вопраткі. [25, с. 6] Іконаграфічная калекцыя прадстаўля матэрыял для доследаў над гісторыяй беларускага мастацтва і параўнання з расейскай іконаграфіяй. Калекцыя змяшчала іконы Рублёўскай і Строганаўскай школы, Наўгародзкага пісьма, іконы бізантыйскага стылю ад XIII ст., каталіцкія абразы, абраз св. Анупрэя работы Смуглевіча. Для даследаванняў па беларускай іканаграфіі вялікую каштоўнасць мае група ікон, якія былі намаляваны на Беларусі і прадстаўлялі сінтэз бізантыйскіх традыцый і заходніх уплываў.

Свецкае малярства прадстаўлена малюнкамі вядомых краёвых маляроў: Смуглевіча, Русецкага, Слендзінскага, - новага беларускага і наагул краёвага малярства: Сергіевіча, Драздовіча, Дыдзякаса, Варнаса, - скульптурай майстроў Грубэрскага, Яхімовіча, Крэменя, Арлоўскага, Антакольскага. Акрамя вышэй названых у музеі захоўваліся творы такім мастакоў, як Канеўскага, Рустэма, Попольфа, Пешкі, Хруцкага, Лосенка, Трутнева, Брулова і Шаламіцкага. [47, с. 36]

У музеі былі прадстаўлены экспанаты майстроў уніяцкага перыяду: мастацтва, графіка, скульптура, сакосы Віленскіх уніятскіх мітрапалітаў XV-XVI ст.

Графіка была прадстаўлена ў постаці зарысовак, гравюр, дрэварытаў, літографіяў. Сярод зарысовак А Луцкевіч выдзяляе альбомы Я. Драздовіча.

Калекцыя гравюрскіх блях і дрэварытных табліц уключала 89 прадметаў. Сярод гравюрскіх блях пераважалі працы віленскіх гравэраў з першай паловы XIX ст.: Маўрыцыуса

Кармеліта, Ставэцкага, Падалінскага, Кіслінга, Эгерфельдэра, Вэйса, Бальцэвіча, Навіцкага, - працы Паўла Флёрыяна Пётровіча XVII ст., крыптонім ТІК (Кельмы 1672 г.), працы Пятроўскага і Пэрля XVIII ст. Калекцыя прадстаўляе каштоўны матэрыял для доследаў над краёвай графікай.

Асобную групу складала калекцыя беларускіх дрэварытаў і каляровых дрэварытаў віленскіх майстроў з XVIII ст. і пач. XIX ст. [25, с. 10] Сярод беларускіх майстроў па дрэварытніцтву вядома вельмі мала іменаў. Віленскі беларускі музей дае нам матэрыялы пра двух з іх: прэзбітэра Жухавіцкай царквы Наваградскага павету Лукаша і майстра Паўла Комара. Жухавіцкае Евангеле пры гэтым змяшчае дрэварыты з подпісам аўтара і прадстаўляе жывы абраз адносінаў у Беларусі ў рэлігійнай сферы ў канцы XVII ст. Дрэварыт П. Комара быў выкрыты І. Луцкевічам і адносіцца да другой паловы XVIII ст. Дрэварыты цікаўныя тым, што маюць подпісы аўтара на беларускай мове.

### 3.1.4. Этнаграфія

Этнаграфічны аддзел захоўваў калекцыі народнай разьбы, музычных інструментаў, шкляных вырабаў. Калекцыя тканін і народнай вопраткі была небагатая і ўключала толькі калекцыю старых сялянскіх і мяшчанскіх гарсэцікаў, узоры світак, сабранне паяскоў, гунькі, зборку зарысовак узораў беларускіх тканін.

Вельмі каштоўнай з мастацкага пункту гледжання з’яўлялася калекцыя твораў народных разьбяроў (фігуры Хрыста і святых з дрэву і металлу), воты з воску, складзеныя ў царкву. [25, с. 11]

Калекцыя музычных інструментаў была прадстаўлена наступнымі: лірай, некалькімі тыпамі дуды, цымбаламі, трубамі пастырскімі і рагамі, жалейкамі. [25, с. 11]

Характэрныя калекцыі гліны, фаянса (віленскага), шкла (Урэчча, Налібокі і інш.). З калекцыі можна выдзяліць люстру з урэцкага шкла з масонскай ложы ў Менску, дошкі “крашаніны” для друкавання ўзорыстага палатна, узоры хлебаробскіх прыладаў.

Бытавы аддзел меў калекцыі старога адзення, слуцкіх паясоў – шаўковых і літых, старажытнай зброі, альбомы, гравюры, фотаздымкі. Ён змяшчаў старадаўнія вопраткі і прыборы да іх, дываны Тызенгаўзаўскай і Несвіжскай фабрык, брокаты, вышыўкі.

Музей змяшчаў вельмі багаты матэрыял сярод зарысовак, гравюр і фатаграфій да беларускага будаўніцтва з каменя і з дрэва. Асаблівую цікавасць уяўляюць характэрныя блёкі, з якіх быў пабудаваны Віленскі замак, а таксама “галоснікі” з Каложскай царквы ў Горадні.

### 3.1.5. Зброя і рыштунак

Калекцыя зброі ўключала розныя яе віды: панцыры, кальчугі, мячы, шаблі, шпагі, пісталеты, стрэльбы, якія датуюцца канцом XVI - пачаткам XIX ст. Найбольшую цікавасць уяўляюць наступныя экспанатаы: мундзіры ўланскія 17 і 19 палкоў з 1812 г., меч віленскага ката і прылады да мукаў. [25, с. 13]

### 3.1.6. Бібліятэка

Так як Вільня з'яўлялася на працягу доўгага часу сталіцай Вялікага княства Літоўскага і ў пачатку XX ст. - цэнтрам беларускага Адраджэння, то культурнае жыццё Беларусі ў асноўным канцэнтравалася тут. Бібліятэчная калекцыя захавала  ў Віленскім беларускім музее шмат старадрукаў, актаў, дакументаў, лістоў, якія маюць дачыненне да гісторыі Вялікага княства Літоўскага і працы беларускіх дзеячаў і арганізацый напачатку XX ст.

Аддзел рукапісаў і друкаў Віленскага беларускага музея меў крыніцы ад XIV ст. да 1943 г. Яго можна падзяліць на дзве групы рукапісаў: адна складаецца са старых рукапісаў, другая – з новых рукапісаў, архіўных матэрыялаў беларускага адраджэнскага руху, дзяржаўнага будаўніцтва і грамадскага жыцця. На думку даследчыка Ю. Лабынцава, рукапісны аддзел быў самым багатым у музеі.

Зараз вялікая частка з гэтага аддзелу знаходзіцца ў бібліятэцы Акадэміі Навук Літвы ў рукапісным фондзе 21. Матэрыялы фонду можна падзяліць на два раздзелы: літаратурны і гістарычны. Літаратурны раздзел уключае тэксты літаратурна-мастацкага, публіцыстычнага характару, багатую эпісталярную спадчыну. Храналагічна ён распадаецца на два перыяды: часоў "Нашай Нівы" і заходнебеларускі. Матэрыялы, звязаныя з "нашаніўскай" парой, прадстаўлены фрагментарна, бо частка з іх была перададзена ў Менск (цяпер захоўваецца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва). Сярод іх прадстаўлены лісты А. Луцкевіча, Б. Тарашкевіча, З. Жылуновіча, газета "Наша Ніва", лісты рэдакцыі газетаў "Наша Ніва" і "Наша воля". Другі перыяд уключае мастацкія тэксты, публіцыстыку заходнебеларускай літаратуры. Прадстаўлена рукапісная спадчына М. Танка, З. Бядулі, М. Багдановіча, Ф. Аляхновіча, Я. Быліны, Я. Чачота, М. В. Доўнар-Запольскага, В. Дунін-Марцінкевіча, У. Дубоўкі, М. Гарэцкага, Ц. Гартнага, А. Гаруна, Я. Коласа, Ядвігіна Ш., Цёткі, В. Ластоўскага, У. Самойлы, А. Смоліча, Р. Шырмы, А. Гаруна, М. Машары, Н. Арсенневай, Х. Ільяшэвіча, А. Салагуба, С. Хмары, В. Грыневіча, С. Грынкевіча і інш., калекцыя фальклорных твораў, запісаных Я. Драздовічам, А. Салагубам, У. Паўлюкоўскім і іншымі збіральнікамі.

Гістарычны аддзел матэрыялаў Віленскага беларускага фонда таксама уключае шэраг дакументаў дзейнасці грамадска-палітычных арганізацый і партый, культурна-грамадскіх і навуковых таварыстваў, якія існавалі ў 1917-1939 гг. Матэрыялы гістарычнага зместу змяшчаюць мноства дакументаў XX ст., а таксама і такіх, што адносяцца да сярэдневякоўя. Многія з іх змяшчаюць звесткі пра гісторыю асобных вядомых родаў на Беларусі, зямельныя адносіны ў мінулым, пра двары, манастыры, цэрквы і касцёлы. У 45 справах згрупаваны акты Вялікага княства Літоўскага (пачынаючы з 1518 г.), напісаныя на старабеларускай, польскай і лацінскай мовах: акты, дадзеныя князямі Вялікага княства Літоўскага касцёлам і манастырам (з 1396 г.); акты, якія датычацца горада Вільні (з 1465 г.), акты князёў Вялікага княства Літоўскага (з 1518 г.).

У гістарычным аддзеле змяшчаюцца наступныя матэрыялы: дакументы Віленскага нацыянальнага камітэта, архіў А. Луцкевіча, матэрыялы, звязаныя з І. Луцкевічам, матэрыялы пра беларускі рух у Горадні, збор матэрыялаў розных беларускіх арганізацый, матэрыялы Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, брашуры і лістоўкі Беларускай сацыялістычнай грамады, збор матэрыялаў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, адозвы Беларускай рады, Акт абвяшчэння незалежнасці Беларусі, Дэкларацыя улады БНР, Акты прадстаўнікоў розных пакаленняў роду Тышкевічаў, Акты роду Сапегаў, роду Радзівілаў (з 1524 г.), роду Кастравіцкіх, роду Саламярэцкіх (з 1530 г.), роду Білевічаў (з 1698 г.), роду Антона Аўдзевіча - рымска-каталіцкага дзеяча, біскупа віленскага, роду Яўгена Букатага, роду А. Данейкі, дакументы М. Касцюшкі, матэрыялы і дакументы Віленскай беларускай гімназіі, матэрыялы Беларускай Народнай Рэспублікі і інш.

Сярод амаль чатырохсот рукапісных кніг Віленскага беларускага музею найбольш цікавымі з'яўляліся беларускія рукапісы кірылаўскага (царкоўнаславянскага) пісьма. З іх можна выдзяліць Жухавіцкае Евангелле XIV ст. – найстарэйшы рукапіс, Віленскае Евангелле, літургічныя праваслаўныя і уніяцкія кнігі XV-XVIII стст., календары, апісанне беларускіх праваслаўных і уніяціх цэркваў і манастыроў, метрычныя кнігі, зборнікі выпісак з дакументаў XVI-XIX стст., - рукапісы лацінскага пісьма: польскамоўныя дзеннікі і апісанні вандраванняў, "Гісторыя каталіцкай царквы ў Расеі" 1828 г., каталіцкія спеўнікі, катэхізісы для беларусаў-католікаў, лацінскамоўныя літургічныя кнігі. [24, с. 7]

Са старых рукапісаў А. Луцкевіч адзначае "Аглашэнні Тодара Студзіты" 1476 г., Евангелле з Мелішава, "Апостал" XVI ст., "Слуцкі памяннік" 1517 г., Дзеянні Апосталаў з сямейнай хронікай Бунакоў (кальвіністаў) з-пад Росеняў пач. XVII ст. на беларукай і польскай мовах, Трэбнік 1545 г., беларускі рукапіс арабскімі літарамі "Аль Кітаб" XVI ст. з Сорак Татар пад Вільняй, устаў Младзенчаскага Брацтва ў Дзісне XVII ст., "Актаіх" XV ст. [25, с. 14]

“Аглашэнні Тодара Студзіты” 1476 г. уяўляюць сабой вельмі рэдкі для славянскай традыцыі літаратурны помнік, перапісаны ў Вільні па загаду пісара вялікага князя Аляксандра.

“Слуцкі памяннік” 1517 г. прадстаўляе інтарэс тым, што змяшчае шматлікія звесткі аб беларускіх праваслаўных родах, у тым ліку і аб Агінскіх.

Рукапіс “Аль Кітаб”, які быў уведзены ў навуковы абарот І. Луцкевічам, даў бясцэнны матэрыял для беларускай філалогіі, для вывучэння старой беларускай мовы XVI – XVII стст. і адкрыў дарогу для далейшых пошукаў у гэтым напрамку. Даследаванню “Аль Кітаба” прысвечаны шэраг прац даследчыкаў: І. Луцкевіча, Я. Станкевіча, А. Антоновіча.

З беларускамоўных рукапісаў, перапісаных лацініцай, трэба адзначыць каталіцкі спеўнік XIX ст., пераклады Евангелля на беларускую мову ў 1912 – 1921 гг., беларускамоўны катэхізіс таго ж часу.

Багатым быў збор і старажытных беларускіх грамат прыватнага і дзяржаўнага характару ад 2-ой пал. XV ст., пергаментаў з подпісамі каралёў XVI ст., архіўных матэрыялаў па жыццю і дзейнасці Базыльянаў ад XVI ст.

Актавыя дакументы прадстаўлены 3824 граматамі XIV-XIX ст.: XIV і XV стст. налічвалася па два дакументы, XVI ст. – звыш трохсот, XVII ст. – каля сямісот, XVIII ст. – каля тысячы ста, XIX ст. – каля палутара тысяч, не датаваных грамат – 250, пергаменных грамат – 51. Сярод старажытных грамат асабліва прыкметны наступныя: грамата пінскага князя Фёдара Іванавіча 1508 г., граматы каралёў Сігізмунда Аўгуста, Стэфана Баторыя, Сігізмунда III, Уладзіслава IV.

Аддзел старадрукаў багаты выданнямі краёвых друкарняў Вільні, Еўі, Лоску, Горадні, Супраслі, Семятычах, Нясвіжу, Слуцку, Полацку, Магілёва, Кутэйна. З замежных старадрукаў вылучаюцца ”Трыёдзь каляровая” 1491 г., купленая ў ксендза А. Станкевіча, Біблія доктара Францыска Скарыны, друкаваная ў Празе ў 1517 г., “Часаслоў” П. Мсціслаўца і І. Фёдарава. З краёвых – першае друкаванае выданне Літоўскага Статуту 1588 г. на беларускай мове, віленскі друк “Казаніе Кірыла” 1596 г. [25, с. 16]

Рукапісы XX ст. уключалі архівы беларускіх выдавецтваў, выданняў, арганізацый, асобных пісьменнікаў, дакументы рускага эміграцыйнага руху, гісторыі ўзаемасувязяў беларусаў з многімі іншымі народамі Еўропы. Тут былі рукапісы М. Багдановіча, Я. Купалы (“Шляхам жыцця”, паэмы “Сон на кургане” і “Паўлінка”), М. Гарэцкага, І. Дварчаніна, В. Жылкі, М. Танка, Р. Шырмы, Ц. Гартнага і іншых беларускіх грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, публіцыстаў, архівы Беларускай Народнай Рэспублікі, Слуцкага пайстання, Беларускага Паольскага клуба пры Польскім сейме, Беларускай Рабоча-сялянскай Грамады, Беларускага Цэнтра ў Літве, Таварыства беларускай школы ў Літве,

Віленскай беларускай гімназіі і музея ў Наваградку, Беларускіх вучыцельскіх семінарый у Барунах і ў Вільні, Беларускіх гімназій у Гродне і Радашковічах, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларускага Навуковага таварыства і Музея ў Вільні, Навуковага таварыства імя Ф. Скарыны, Камуністычнай пасольскай фракцыі, беларускай сялянскай партыі "Зялёны дуб", дзесяткі іншых архіваў розных беларускіх партый, камітэтаў, аб'яднанняў, фондаў, падборкі сакрэтных дакументаў і паведамленняў польскай дэфензівы аб беларускім палітычным руху, дакументы Рускага нацыянальнага камітэту ў Вільні, беларускага каталіцкага выдавецкага таварыства і інш. [24, с. 10]

Пры музеі існаваў архіў, які ўвабраў у свае фонды архівы газет "Наша Ніва", "Гоман", "Голас беларуса", часопісаў "Крывіч", "Маланка" і інш.; архівы беларускіх партый, камітэтаў, саюзаў, таварыстваў; дакументы Віленскага народнага універсітэта, Беларускага навуковага таварыства, асабістыя архівы Л. Дубейкаўскага, К. Душ-Душэўскага, П. Жаўрыда, В. Ластоўскага, І. і А. Луцкевічаў, А. Смоліча, Цёткі і інш.

Каштоўны матэрыял для вывучэння даследчыкам даюць лісты розных дзеячаў палітыкі і культуры пачатку ХХ ст. Яны змяшчаюць інфармацыю пра беларускае Адраджэнне таго перыяда. Так, можна пазнаёміцца з беларускай тэатральнай спадчынай з рукапісаў п'есы Аляхновіча "На Антокалі", лістоў Аляхновіча з турмы А. Лукцевічу, рукапісаў п'есы І. Анісковіча, камедыі "Нервы", п'есаў "Не зразумелі" М. Нядолі і "Беларускае вяселле" А. Салагуба. Шмат біяграфічнай інфармацыі змяшчаецца ў захоўваўшыхся ў музеі лістах гістарычных дзеячаў: Н. Арсенневай, Л. Гмырака, М. Багдановіча, З. Бядулі, Я. Быліны, Я. Драздовіча, У. Дубоўкі, І. Дварчаніна, А. Гаруна, Т. Грыба, М. Кахановіча, К. Каганца, Я. Лёсіка, Я. Карскага, М. Машары, Б. Пачобкі, П. Сеўрука, А. Смоліча, А. Салагуба, Я. Станкевіча, Б. Эпімаха-Шыпілы, Р. Шырмы, Я. Варонкі, З. Жылуновіча.

З мастацкай кніжнай спадчына захоўваліся рукапісы З. Бядулі "Сіла ў грамадзе", "Святое гэта месца", "Закалдаваны", "Дзень добры ў хату", вершы Я. Быліны, рукапісы вершаў К. Буйло, вершы Я. Буйніцкага, вершы А. Салагуба, Я. Чачота, Ц. Гартнага, А. Гаруна, С. Глебава, К. Сваяка, П. Сушко, М. Крывіцкага, Я. Журбы, У. Жылкі, твор У. Дубоўкі "Маладзякоўскія шляхі", рукапіс паэмы В. Дунін-Марцінкевіча "Гапон", вершы і рукапіс Я. Коласа "У палескай глушы", рукапісы Цёткі, рукапіс "Віленскіх камунараў" М. Гарэцкага. Матэрыялы публіцыстычна-навуковага характару прадстаўлены наступнымі творамі: брашурай М. В. Доўнар-Запольскага "Асновы дзяржаўнасці Беларусі", артыкуламі У. Паўлюкоўскага "Статут ВКЛ", "Іван Насовіч", "Чвэрць стагоддзя ад смерці, паўстагоддзя ад нарадзінаў М. Багановіча", даследаваннямі М. Шчаглова "Беларуская народная песня. Спроба музычнага даследавання", "Беларуская граматыка" Б. Тарашкевіча, архіўнымі матэрыяламі К. Тышкевіча,

матэрыяламі пра беларускі рух у Гродне, “Нарыс гісторыі беларускага нацыянальнага руху” С. Віславуха на польскай мове, “Дваццаць пяць гадоў беларускаму тэатру” В. Грышкевіча, “Слоўнік беларускай мовы Я. Ціхінскага”, сачыненнямі па геаграфіі Беларусі слухачоў Беларускіх настаўніцкіх курсаў, артыкулам 1920 г. “Эканамічнае становішча Беларусі і Літвы”, “Беларускія песні: фальклорныя запісы” 1920 г., “Гісторыя Беларусі ў картах” Самко.

З прадстаўленай рукапіснай спадчыны можна вывучаць жыццё, дзейнасць і творчасць значных асобаў у беларускай гісторыі.

У музее была прадстаўлена багатая спадчына Я. Драздовіча, беларускага мастака, фалькларыста, археолага і палітычнага дзеяча першай паловы XX ст.: лісты, спісы яго прац, рукапісы аповесцей “Гарадальская пушча”, “Трывеж, жыццё на Месяцы”, “Жыццё на марсе”, “Гармонія планет сонечнай сістэмы”, слоўнікавая лексіка Піншчыны і Дзісненшчыны.

Са спадчыны Лявона Вітан-Дубейкаўскага, беларускага архітэктара, будаўніка, грамадскага дзеяча, педагога, паэта, захаваліся пагаворкі і пасловіцы, даследаванне на беларускай і польскай мовах “Эвалюцыя і рэформа дзераўлянага будаўніцтва”.

Спадчына М. Гарэцкага, пісьменніка, літаратуразнаўцы, лексыкографа, фалькларыста, была прадстаўлена яго лістамі, навуковымі творамі “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Беларускае пісьменства: Кароткі агляд беларускага пісьменства”.

Спадчына Хв. Ільяшэвіча, беларускага паэта, журналіста, гісторыка, палітычнага дзеяча змяшчала каштоўны матэрыял па даследаванню жыцця і творчасці Ядвігіна Ш., беларускага празаіка, публіцыста, драматурга, а таксама вершы, апавяданні і лісты.

Літаратурная спадчыка В. Ластоўскага, пісьменніка, гісторыка, літаратуразнаўцы, публіцыста і палітычнага дзеяча складалася з рукапісаў, артыкулаў, музейных запісаў, Нарысаў беларускай гісторыі, “Гісторыі беларускай (крэўскай) кнігі”, “У высокую Лігу Нацый у Жэневе”.

Літаратурная спадчына А. Луцкевіча змяшчала наступныя яго працы: “Беларуская граматыка”, лекцыі з настаўніцкіх курсаў “Як правільна пісаць па-беларуску”, пераклады падручнікаў, артыкулы “Краёвае становішча”, “К предстоящим выборам в Белоруссии”, “Национальное возрождение белорусов”, рэферат пра часопіс “Гоман” і беларускіх народнікаў “Да пытання аб эвалюцыі палітычнай ідэалогіі беларусаў у XX ст.”.

Літаратурная спадчына паэта і этнографа У. Паўлюкоўскага была прадстаўлена рукапісамі этнаграфічных артыкулаў “Сёмуха”, “Піліпаўка”, “Вячоркі”, “Пасядзелкі”, “Калядны тыдзень”, народнымі песнямі, запісанымі ў 1929 годзе.

Спадчына Б. Тарашкевіча, беларускага грамадска-палітычнага дзеяча, мовазнаўцы, перакладчыка, публіцыста, была прадстаўлена яго артыкуламі, лістамі, дакументамі, у тым ліку і рукапісам палітычнай платформы БСРГ.

У музеі былі сабраны працы па ваеннай справе А. Ружанцова, беларускага вайсковага дзеяча, пісьменніка, бібліёграфа: "Беларускія войскі ў Літве, 1918 - 1920", "Кароткі вайскова-гістарычны агляд", "Беларускія вайсковыя песні", "Каманды і назовы ў беларускіх аддзелах літоўскага войска".

Літаратурная спадчына Ст. Грынкевіча, беларускага пісьменніка, культурнага, грамадскага і палітычнага дзеяча была прадстаўлена артыкуламі "У Палескай глушы", "Нацыянальная ідэалогія", "Сутнасць з'явішча нацыянальнага".

Для вывучэння дзейнасці палітычных і грамадскіх арганізацый цікаўнасць уяўляюць наступныя архіўныя матэрыялы: дакументы Віленскага Нацыянальнага камітэта, архіў А. Луцкевіча (перапіска з Таварыствам беларускай школы, Беларускім студэнцкім саюзам, нота Савета Міністраў БНР ураду Антанты і іншыя матэрыялы, якія датычацца міжнародных спраў), газеты "Наша ніва", "Вольная Літва" Я. Варонкі, цыркуляр Беларускай сялянска-работніцкай грамады, матэрыялы КПЗБ, брашуры і лістоўкі Беларускай сацыялістычнай грамады, збор матэрыялаў Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў за 1918 – 1927 гг., Беларуская сацыял-дэмакратыя, адозвы Беларускай рады 1919 – 1936 гг., пратакол з'езда беларускіх нацыянальных арганізацый, запрашэнні на Беларускую канферэнцыю ў Вільні, Акт абвяшчэння незалежнасці Беларусі, Дэкларацыя ўлады БНР, Грамата часовага Літоўскага ўрада 1919 г., умова беларускай выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца", марш беларускай асобай роты Літоўскага войска 1920 г., каталог бібліятэкі-чытальні "Веды", "Статут беларускага вучыцельскага саюзу", Віленскі беларускі камітэт, матэрыялы і дакументы Віленскай беларускай гімназіі (1919 – 1944 гг.), матэрыялы беларускай канферэнцыі ў Вільні, матэрыялы Беларускай Народнай Рэспублікі, палітычныя пастулаты Беларусі, апрацаваныя Б. Тарашкевічам, матэрыялы Беларускай цэнтральнай вайсковай рады, Беларускай дэлегацыі на Парыжскую мірную канферэнцыю, Беларускага пасольскага клуба 1922 – 1925 гг., Беларускай народнай рады 1920 – 1926 гг., Беларускай народнай партыі сацыялістаў, Беларускай рады ў Вільні 1919 – 1920 гг., Беларускай сялянска-работніцкай грамады 1927-1928 гг., Пецярбургскага таварыства студэнтаў-беларусаў 1912 – 1917 гг., Рады беларускай нацыянальнай сувязі 1921 г., Вялікай беларускай рады 1917 г, Цэнтральнай беларускай школьнай рады, Беларускай драматычнай майстроўні 1919 – 1924 гг.

Можна сказаць, што ідэі краёвасці знайшлі сваё адлюстраванне і ў калекцыях музею, бо ў іх прадстаўлены не толькі помнікі беларускай гісторыі, культуры і мастацтва, але і рускай,

польскай. Таксама у музеі былі прадстаўлены экспанаты іншых нацый: турэцкія, італьянскія, галандскія, у тым ліку, зброя гістарычнага паходжання (казацкія ружжа, шаблі славянскіх дружынаў, першыя пісталеты), экспанаты Напалеоноўскай эпохі, работы Рэмбрандта і Кале (італьянская графіка), калекцыя малюнкаў еўрапейскіх мастакоў. [8, с. 208]

Кнігазбор І. Луцкевіча і частка кнігазбору Раманава маюць асаблівую вагу для беларусазнаўства: "Белорусский сборник" і фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы Е. Р. Раманава. Кнігазбор Даніловіча быў багаты кнігамі агульна-навуковага характару. Асаблівую каштоўнасць уяўляла зборка гэтак званых "тоўстых" расейскіх часопісаў. У іх змяшчаўся багаты матэрыял дзеля вывучэння грамадскага жыцця і грамадскіх настрояў у даваеннай Расеі. Музей змяшчаў этнагафічыя матэрыялы А. Гурыновіча., даследаванні К. Езавітава "Беларускія народныя і фабрычныя паясы", фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы С. Сахарава, "Беларуска-жыдоўскі фальклор з мястэчка Даўгінава" В. Сосенскага, рукапісы Я. Станкевіча 1908 – 1917 гг. "Этнаграфічныя граніцы Беларусі", "Беларуская народная творчасць" (фальклорныя запісы).

Увогуле фонды аддзелу рукапісаў і друкаў Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча маюць вялікае значэнне дзеля вывучэння гісторыі беларускага Адраджэння. Увагу заслугоўваюць першыя творы адраджэнскага руху, пачынаючы з XIX ст.: А. Рыпінскага "Bialorus" (Парыж, 1840), зборнікі песняў Я. Чачота, Беларускі Катахізм з 1835 г., першыя выданні твораў Дунін-Марцінкевіча і Багушэвіча, рэдкія брашуры палітычнага характару (Драгоманава "Пра беднасць та батацтво", Жэнева 1881 г.), экзэмпляр часопіса беларусаў-народавольцаў "Гоман" № 2 за 1884 г., друкі з пачатку XX ст., камплекты першых беларускіх газет – "Наша доля" і "Наша ніва", "Покліч", "Прыма апрыліс", часопісы "Рунь" 1923 г., "Рэха" 1927 г., "Васілёк" 1928 г., "Вайсковы", "Светазар". Увогуле, у музеі былі сабраны гадавікі выходзіўшых на беларускай мове часопісаў і кніжак усялякага зместу.

Калекцыі Віленскага беларускага музея маюць вялікую каштоўнасць для Беларусі, так як яны ўяўлялі сабой паўнавартасную калекцыю музея як навуковай установы, даследваліся і былі апісаны ў каталогу. Калекцыя носіць сістэмны характар і ўтварае самадастатковыя разделы, якія дазваляюць пазнаёміцца з рознымі гістарычнымі эпохамі і відамі мастацтва. Пры гэтым даследаванне фондаў мае вялікае значэнне для поўнага вывучэння і асэнсавання ўвогуле гісторыі Беларусі і ў прыватнасці гісторыі беларускага Адраджэння ў Вільні ў рамках усёй гісторыі Беларусі. Археалагічная калекцыя дазваляе на аснове наяўных экспанатаў пазнаёміцца з эпохамі палеаліту, неаліту, бронзавага і жалезнага перыядамі, вывучыць характарыстыкі рэлігійнага мастацтва Беларусі на прыкладзе абразкоў святых з медзі, на металю і воты з XII ст. і скульптуры. Гісторыю Вялікага княства Літоўскага дапамагаюць даследаваць збор манет,

калекцыя медаляў, помнікі мастацтва уніятскага перыяда, калекцыя старадрукаў і рукапісаў. Калекцыя Віленскага беларускага музея змяшчае экспанаты для даследавання беларускага мастацтва па калекцыях свецкага жывапісу беларускіх і краёвых мастакоў, іканаграфіі - па калекцыях ікон. З прадстаўленай рукапіснай спадчыны можна вывучаць жыццё, дзейнасць і творчасць значных асобаў у беларускай гісторыі. Таксама кнігазбор І. Луцкевіча і частка кнігазбору Раманава маюць асаблівую вагу для беларусазнаўства, беларускай філалогіі і літаратуры.

### 3.2. Лёс музейнай калекцыі пасля арышту А. Луцкевіча

Шматгадовая дзейнасць Беларускага музея імя І. Луцкевіча дае падставу гаварыць пра існаванне ў першай палове XX стагоддзя ў гістарычнай сталіцы Беларусі нацыянальнага музея, аб'яднанага з бібліятэкай і архівам. Аднак, актывізацыя беларускага культурнага жыцця выклікала занепакоенасць у віленскіх гарадскіх улад. Напярэдадні Другой сусветнай вайны яны перапынілі фінансаванне Беларускага музея, распрацавалі планы яго злучэння спачатку з музеем Віленскага таварыства сяброў навук, потым – з музеем Літоўскага навуковага таварыства.

Ліквідацыі Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча папярэднічалі наступныя падзеі ў гісторыі горада. 19 верасня 1939 года Вільня была занята савецкімі войскамі. 10 кастрычніка 1939 года быў падпісаны "Дагавор аб перадачы Літоўскай рэспубліцы горада Вільні і Віленскай вобласці і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой". [34, с. 179] Паміж гэтымі дзвюма датамі, перад самай эвакуацыяй савецкай адміністрацыі, у Вільні былі арыштаваны Ул. Самойла, А. Неканда-Трэпка, Я. Пазняк, В. Багдановіч і іншыя дзеячы Віленскага беларускага музея. 30 верасня 1939 г. быў арыштаваны дырэктар музея, старшыня Беларускага навуковага таварыства, А. Луцкевіч. Ад кастрычніка 1939 г. да 15 чэрвеня 1940 г. музей быў фактычна нячынны. З успамінаў Марыяна Пецюкевіча мы даведваемся: "У выніку арыштаў Беларускі музей быў пазбаўлены кіраўніцтва і працаўніка ў адной асобе, а Беларускае навуковае таварыства – свайго лідэра. На дзвярох Беларускага музею вісеў замок і мала хто ведаў, у каго знаходзяцца ключы". Беларускае навуковае таварыства ў Вільні спыніла сваё існаванне, і ў кастрычніку 1940 г. музей быў перададзены ў ведамства Інстытута літуаністыкі, які падпарадкоўваўся Народнаму Камісарыяту асветы Літвы. На базе Інстытута літуаністыкі была створана Акадэмія навук Літоўскай ССР, і музей імя І. Луцкевіча перайшоў у яе падпарадкаванне. [34, с. 179]

Штатных работнікаў у музей прызначаў прэзідэнт АН ЛССР прафесар Вінцас Крэве-Міцкявічус. Дырэктарам музею стаў выпускнік Віленскага універсітэта, этнограф магістр

М. Пецюкевіч. Штатнымі работнікамі музея былі мастак П. Сергіевіч, музейшчык Александровіч, бібліятэкар Я. Шутовіч. [47, с. 36]

На пасадзе дырэктара музея М. Пецюкевіч прабыў да сваёй эвакуацыі 7 ліпеня 1941 г. Пасля гэтага дырэктарам Віленскага беларускага музея Акадэміяй Навук ЛССР быў назначаны Я. Шутовіч. [47, с. 37]

Падчас вайны музей працаваў і быў адчынены для наведвальнікаў. Ад пачатка акупацыі музей некаторы час знаходзіўся ў сістэме Літоўскай Акадэміі навук, пасля быў выдзелены ў асобную самастойную адзінку з назвай “Віленскі беларускі музей”, падпарадкаваную непасрэдна дэпартаменту навукі і мастацтва пры кіраўніцтве асветы. Змяніўся склад работнікаў музея: выбыў П. Сергіевіч, прыняты былі ў якасці штатных работнікаў мастак-графік, гісторык мастацтва В. Дрэма, нумізматык Я. Бэкіш, бібліятэкар і сакратар музея У. Паўлюкоўскі. У пачатку 1944 г. нямецкія акупацыйныя ўлады загадалі музею пакінуць займанае ім памяшканне ў Базыльянскіх мурах і заняць новы будынак па вул. св. Ганны, 4. Там музей прабыў да сваёй поўнай ліквідацыі. [47, с. 37]

З успамінаў Я. Шутовіча, мы даведваемся, што частка найбольш каштоўных экспанатаў падчас Другой сусветнай вайны перазахоўвалася ў касцёле св. Міхаіла, адміністратарам якога ў той час быў А. Станкевіч. [47, с. 38] У гэты час працу ў музеі пакінулі В. Дрэма і Я. Бэкіш. На іх месца паступілі Ф. Стэцкевіч, П. Сергіевіч і М. Фёдараў.

Пасля вызвалення Вільні ў ліпені 1944 г. музей стаў падпарадкоўвацца Камітэту па справах мастацтваў Літоўскай ССР, пазней – Наркамасветы Літоўскай ССР. У гэты перыяд для музея адводзіцца новы будынак – асабняк па вул. Касцюшкі, 16. Але заняць будынак музею не далі, бо канчаткова ён быў прызначаны іншай арганізацыі.

19 лістапада 1944 г. у Беларускім музеі з’явілася ўрадавая дэлегацыя БССР з прапановай пераехаць у Менск. Дзеля канчатковага вырашэння гэтага пытання Я. Шутовіч прапанаваў 21 лістапада правесці нараду з удзелам беларускай грамадскасці. Але 20 лістапада Я. Шутовіч быў арыштаваны і нараду правесці не ўдалося. На месца дырэктара Віленскага беларускага музея быў прызначаны Ю. Пятруліс.

З мэтай ліквідацыі Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча Саўнаркамам Літвы была ўтворана ліквідацыйная камісія, куды ўвайшлі: старшыня – намеснік народнага камісара асветы М. Мешкаўскене, прадстаўнік ЦК дацэнт гісторыі А. Даўкша-Пашкявічус, дырэктар музея АН ЛССР кандыдат навук К. Мякас. [47, с. 39] 24 лістапада 1944 г. яны правялі першае паседжанне, дзе разглядаліся наступныя пытанні: 1) устанаўленне прынцыпу адбору экспанатаў; 2) тэхнічная старана адбору экспанатаў; 3) апісанне і падрыхтоўка да вывазкі экспанатаў; 4) правядзенне інвентарызацыі выбраных да вывазу экспанатаў; 5) запакоўка

выбраных да вывазу экспанатаў; 6) просьба адпусціць крэдыты на аплату вышэй пералічаных работ. [47, с. 39]

На паседжанні ліквідацыйнай камісіі былі прыняты наступныя пастановы: “Усе экспанаты падзяліць на групы: 1) экспанаты, якія маюць адносіны да гісторыі літоўскага народа; 2) экспанаты, якія маюць адносіны да гісторыі беларускага народа; 3) экспанаты, якія маюць адносіны да гісторыі і літоўскага, і беларускага народаў; 4) экспанаты, якія не маюць адносіны да гісторыі ні літоўскага, ні беларускага народаў. Усе экспанаты першай і чацвёртай груп пасля адбору пакінуць у Літве. Дублікаты гэтых экспанатаў, або калі экспанатаў гэтых груп і зродненых з імі есць вялікая колькасць, то яны могуць быць адабраны для вывазу. Экспанаты другой групы адбіраюцца для вывазу. Але дублікаты іх, або калі ёсць зродненых з імі большы лік  і калі такіх экспанатаў у музеях ЛССР няма або ёсць мала, то такія экспанаты могуць быць пакінуты ў Літве. Адбіраючы экспанаты трэцяй групы, належала трымацца наступнага прынцыпу: якой савецкай рэспубліцы ці народу экспанат мае большую навуковую, мастацкую, гістарычную, культурную ці іншую вартасць, туды яго і прызначыць”. [47, с. 40] Для адбору экспанатаў вырашана было запрасіць спецыялістаў-экспертаў адпаведнага профілю. Пастаноўлена было запрасіць наступных экспертаў: прафесара Пакаркліса, прафесара Яблонскага, прафесара д-ра Я. Вальджуса, дацэнта Кулікаўскаса, прафесара Велюкаса, прафесара мастака Гудайціса, мастака Дрэму, мастака Ст. Вайткуса, бібліёграфа А. Пошку, музейніка В. Гвітаўтаса, геолага В. Чэпулітэ. Для выканання тэхнічных работ прыцягваліся супрацоўнікі Беларускага музея і Народнага Камісарыяту Асветы Літвы.

Для ўдзелу ў працы ліквідацыйнай камісіі таксама была запрошана дэлегацыя з Менска, якую ўзначаліў Сабін. Экспанаты, адабраныя для вывазу ў БССР, былі адпаведна апісаны, сфатаграфаваны і зафіксаваны малюнкамі; быў зроблены інвентарны акт на дзвюх мовах – літоўскай і рускай. У чэрвені 1945 г. ліквідацыйная камісія правяла яшчэ адно паседжанне.

Лёс фондаў і ўсіх збораў можна прасачыць па пратаколах ліквідацыйнай камісіі, па інвентарных кніжках і запісах тых арганізацый і ўстаноў, якія атрымалі экспанаты з паасобных фондаў музею.

У выніку ліквідацыі Віленскага беларускага музея яго экспанаты, кнігі і дакументы апынуліся па наступных навуковых і музейных установах: у горадзе Вільні – Гісторыка-этнаграфічны музей АН Літвы і яго філіялы (Карцінная галерэя і інш.), Літоўскі дзяржаўны мастацкі інстытут, бібліятэка АН Літвы, Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы; у горадзе Менску – Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальны мастацкі музей Беларусі, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, Нацыянальны архіў Беларусі, Літаратурны музей Янкі

Купалы, Прэзідэнцкая бібліятэка, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, Фундаментальная бібліятэка АН Беларусі. [34, с. 181]

Усе архівы былі забраны НКУС Літвы раней за паседжанне ліквідацыйнай камісіі летам 1944 г., праз месяц пасля вызвалення Вільнюса ад немцаў. [24, с. 10] Пералік архіваў Беларускага музею ў Вільні, забраных НКУС пры ЛССР 15/16 VIII 1944 г., які зрабілі супрацоўнікі Беларускага музея, змяшчаецца ў Дадатку 3.

Частка архіву і бібліятэчнага фонду ў 1945 г. трапіла ў Цэнтральную бібліятэку АН ЛССР: аддзелы рукапісаў і старадрукаў. У ім знаходзяцца аўтографы, рукапісы, машынапісы беларускіх пісьменнікаў, моваведаў, фалькларыстаў ад 1850 да 1939 гг. [47, с. 42]

У Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы змяшчаецца рукапісны фонд 21, які быў сфарміраваны на базе архіўных матэрыялаў Віленскага беларускага музея імя І. Луцкевіча. У складзе Віленскага беларускага фонда, як ён класіфікуецца ў складзе рукапісных фондаў Літвы, захоўваецца 2309 адзінак. Яго матэрыялы ахопліваюць перыяд ад XV ст. да 1943 года. [10, с. 112] У 1963 г. Цэнтральная бібліятэка АН Літвы выдала кнігу “Собрание рукописей”, дзе знаходзіцца і Віленскі беларускі фонд. [34, с. 183] У аддзеле старадрукаў Цэнтральнай бібліятэкі АН Літвы захоўваюцца Літоўскі Статут 1588 г., “Учительное Евангелье” з 1616 г., “Трыёдзь каляровая” 1491 г., Біблія доктара Ф. Скарыны 1517 г.

У гістарычна-этнаграфічным музеі Літвы знаходзяцца слуцкія паясы, урэчскае і налібокскае шкло, народнае ткацтва, прадметы мастацтва, скульптуры і графікі.

Рукапісы Я. Купалы “Шляхам жыцця”, паэмы “Сон на кургане” і “Паўлінка” сення знаходзяцца ў Літаратурным музеі Я. Купалы ў Менску. Некаторыя экспанаты з іканаграфічнага аддзелу музея, народнай разьбы, індывідуальных твораў мастакоў знаходзяцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі. З фатаграфічнага фонду музея шмат адзінак знаходзіцца ў архіве фота-фонадакументаў Беларусі. Некаторыя архіўныя матэрыялы ў выніку падзелу збораў апынуліся ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі. [47, с. 41]

Невялікая частка збораў Беларускага музею паступіла ў Фундаментальную бібліятэку АН Беларусі. Гэта зборы з кніжных і рукапісных фондаў, фотаздымкі і рэпрадукцыі з экспанатаў музея – з аддзелу жывапісу, графікі, этнаграфіі, з фатаграфічнага фонду. Некаторая частка экспанатаў, фотаздымкаў, дакументаў беларускага музея пасля яго ліквідацыі трапіла ў прыватныя рукі. У П. Сергіевіча апынуліся работы мастакоў Я. Драздовіча, скульптара Р. Яхімовіча, дрэварыт П. Комара, карціна К. Брулова. Частку з гэтых экспанатаў П. Сергіевіч перадаў у Менск.

У 1954 і 1960 гг. частка экспанатаў музея была перададзена ў Дзяржаўны музей БССР і Дзяржаўны мастацкі музей БССР. У 1961 г. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў шмат матэрыялаў перадаў Галоўнаму архіўнаму ўпраўленню пры Савеце Міністраў БССР у Менску.

У 1978 г. невялікая частка экспанатаў, пераважна этнаграфічных – народнае ткацтва і кераміка, былі перададзены музею старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. [9, с. 41]

У Цэнтральным дзяржаўным архіве – музеі літаратуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь захоўваецца частка матэрыялаў Беларускага музея: ф. 3, оп. 1-2, усяго звыш 330 спраў, якія адносяцца да 1845 – 1942 гг. [24, с. 6]

Музейшчыкі, гісторыкі, архівісты ў 1996 г. у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі аганізавалі выстаўку “Спадчына, якая належыць Беларусі”, прысвечаную 75-годдзю музея і 115-годдзю нараджэння яго заснавальніка І. Луцкевіча. На выстаўцы экспанаваліся рэчы, кнігі і дакументы, якія захоўваюцца ў музеях, архівах і бібліятэках Менска. [34, с. 182] Там былі прадстаўлены творы выяўленчага мастацтва Я. Драздовіча, П. Сергіевіча, В. Флёры, Я. Валакіты, А. Панятоўскага, разьба па дрэве Я. Драздовіча, іканапіс, XVII – пач. XX ст., культавыя рэчы XIX – XX ст., музычныя інструменты XIX – XX ст., скульптура XVII – пач. XX ст., пячаткі і штампы беларускіх арганізацый і ўстаноў першай паловы XX ст., кераміка пачатку XX ст., прадметы археалагічных раскопак, афішы, дакументы першай паловы XX ст., паштоўкі, фатаграфіі. Выстава мела вялікае значэнне для культуры Беларусі, так як нагадвала беларускаму грамадству аб такой яскравай з’яве ў гісторыі і культуры Беларусі, як Віленскі беларускі музей імя І. Луцкевіча і аб яго заснавальніку.

Такім чынам, дзейнасць першага нацыянальнага беларускага музея ў Вільні пасля арышту яго дырэктара А. Луцкевіча была прыпынена ў выніку дзяржаўнай камуністычнай палітыкі. Калекцыі музея былі нераўназначна падзелены паміж літоўскімі і беларускімі навуковымі ўстановамі. Значная колькасць прадметаў беларускага паходжання апынулася ў музеях і навуковых установах Літоўскай Рэспублікі, што цяпер стварае перашкоды для іх усебаковага даследавання беларускімі гісторыкамі і вучонымі.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

1. Браты Іван і Антон Луцкевічы зрабілі вялікі ўнёсак у беларускае нацыянальнае Адраджэнне пачатку ХХ стагоддзя: стварылі яго цэнтр і асяродак. Яны абодва былі вядомымі палітычнымі і грамадскімі дзеячамі, якія садзейнічалі пашырэнню асветы сярод беларускага насельніцтва. Іван і Антон Луцкевічы з'яўляліся аднымі з пачынальнікаў і ідэйных кіраўнікоў беларускага культурна-асветніцкага, грамадска-палітычнага руху напачатку ХХ стагоддзя. У дзейнасці па развіццю беларускай культуры браты Луцкевічы выходзілі за межы этнакультурнага разумення беларускага руху, а таксама этнакультурнага бачання гісторыі, у тым ліку і беларускіх земляў. На грунце палітычнай, навуковай і культурнай працы яны актыўна супрацоўнічалі з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Браты Луцкевічы прытрымліваліся краёвай ідэалогіі, якая сведчыла, што культурны і палітычны рост беларускага народа цесна звязаны з уздымам усяго краю. Гэта ў значнай ступені адбілася і на складзе музейных калекцый Івана Луцкевіча, дзе былі прадстаўлены экспанаты, што мелі дачыненне да літоўскай, польскай і яўрэйскай гісторый.

Культурніцкая дзейнасць братоў Луцкевічаў спрыяла пашырэнню асветы сярод беларускага насельніцтва і ведаў пра гісторыю і мастацтва Беларусі сярод іншых народаў. Музейная дзейнасць мела вялікае значэнне не толькі для Адраджэння Беларусі ўвогуле, але і для развіцця музейнай справы на Беларусі. І. Луцкевіч не здолеў арганізаваць музей у навуковую ўстанову, аднак ён зрабіў значны крок дзеля гэтага, сабраўшы за сваё жыццё значную калекцыю для арганізацыі такога музея. Збіральніцкая дзейнасць І. Луцкевіча праходзіла неадрыўна ад яго палітычных поглядаў і дзейнасці, бо стварэнне беларускага нацыянальнага музея павінна было ў некаторай ступені служыць адукацыйным мэтам і адраджэнню незалежнасці края. І. Луцкевіч надзвычайна глыбока асэнсаваў прыналежнасць культурнай спадчыны свайму народу. Яго збіральніцтва мела ясна вызначаны напрамак: на аснове праўдзівай гісторыі абгрунтаваць права беларускага народа на самавызначэнне.

Дзейнасць самога музея падтрымлівалася працай і сродкамі А. Луцкевіча, які зрабіў значны ўклад у фармаванне музея ў навуковую і ўпарадкаваную ўстанову. Менавіта ён стварыў музей на аснове калекцый І. Луцкевіча, бібліятэкі "Веды" Б. Даніловіча і часткі бібліятэкі Е. Р. Раманава, зрабіў інвентарызацыю яго экспанатаў і каталагізацыю кніг і быў іх захавальнікам. Паралельна з працай у музеі А. Луцкевіч знаходзіў час на літаратурную, дыдактычную працу ў Віленскай беларускай гімназіі і на грамадскую працу ў Беларускім Навуковым Таварыстве. Ён праз друк папулярызаваў беларускую справу і спадчыну на міжнароднай арэне.

2. Музейная дзейнасць мела вялікае значэнне не толькі для Адраджэння Беларусі ўвогуле, але і для развіцця музейнай справы на Беларусі. І. Луцкевіч унес у музейнае будаўніцтва прынцыпова адметны змест, а менавіта перавод гэтай справы з рэек рэгіянальнага (краёвага) і прыватнага калекцыянавання папярэднікаў (братоў Тышкевічаў, Г. Татура, І. Каладзеева, А. Ельскага) на ўласна беларускія, агульнаграмадскія падваліны. Адсюль зыходзіць і нацыянальнае значэнне музейных збораў І. Луцкевіча.

Збіральніцтва І. Луцкевіча мела таксама вялікае значэнне для развіцця музейнай справы іншых народаў: яўрэяў, палякаў, украінцаў, - так як ён перадаваў ім у карыстанне рэчы са сваіх калекцый.

Віленскі беларускі музей імя І. Луцкевіча меў вялікі ўплыў на духоўнае станаўленне і нацыянальную свядомасць беларусаў. З рэальнай, арганізаванай па прынцыпу любой падобнай установы ён ператварыўся ў сцяг нацыянальнай ідэі, стаў помнікам беларускаму Адраджэнню пачатку ХХ стагоддзя. Калекцыя музея выконвала важную ролю, прапагандуючы гісторыю Беларусі сярод перадавой беларускай інтэлігенцыі, і натхняла пісьменнікаў, што гуртаваліся вакол газеты “Наша Ніва”.

Калекцыі Віленскага беларускага музея вывучаліся і даследваліся як беларускімі дзеячамі навукі і культуры, так і замежнымі. У перыяд нямецкай акупацыі Вільні яны садзейнічалі распаўсюджванню ведаў пра гісторыю і культуру Беларусі і яе народа сярод нямецкіх вучоных і даследчыкаў.

3. Калекцыі Віленскага беларускага музея маюць вялікую каштоўнасць для Беларусі, так як яны ўяўлялі сабой паўнавартасную калекцыю музея як навуковай установы, даследваліся і былі апісаны ў каталогу. Калекцыя носіць сістэмны характар і ўтварае самадастатковыя разделы, якія дазваляюць пазнаёміцца з рознымі гістарычнымі эпохамі і відамі мастацтва. Збор І. Луцкевіча складаўся з наступных раздзелаў: археалогія, нумізматыка, мастацтва, этнаграфія, зброя і рыштунак, бібліятэка. Пры гэтым даследаванне фондаў мае вялікае значэнне для поўнага вывучэння і асэнсавання ўвогуле гісторыі Беларусі і ў прыватнасці гісторыі беларускага Адраджэння ў Вільні ў пачатку ХХ ст.

Фонды Віленскага беларускага музея ўяўляюць вялікую цікаўнасць для навуковых даследчыкаў з розных краін, так як яны захоўвалі прадметы, якія прадстаўляюць гісторыю не толькі беларусаў, але і іншых народаў. Музей уваходзіў у саюз музееў Польшчы і быў зарэгістрыраваны ў спісе музееў, выданным Лігай Нацый.

Калекцыя Віленскага беларускага музея садзейнічала даследаванню розных накірункаў гісторыі, культуры і мастацтва Беларусі. Яна дазваляла на аснове наяўных экспанатаў пазнаёміцца з археалагічнымі экспанатамі  эпохі палеаліту, неаліту, бронзавага і жалезнага

перыядаў, даследаваць характарыстыкі рэлігійнага мастацтва Беларусі на прыкладзе абразкоў святых з медзі, на металю і воты з XII ст. і скульптуры. Гісторыю Вялікага княства Літоўскага дапамагаюць вывучаць збор манет, калекцыя медаляў, помнікі мастацтва уніятскага перыяда, калекцыя старадрукаў і рукапісаў. Калекцыя Віленскага беларускага музея змяшчае экспанаты для даследавання беларускага мастацтва па калекцыях свецкага жывапісу беларускіх і краёвых мастакоў, іканаграфіі - па калекцыях ікон. З прадстаўленай рукапіснай спадчыны можна вывучаць жыццё, дзейнасць і творчасць значных асобаў у беларускай гісторыі. Таксама кнігазбор І. Луцкевіча і частка кнігазбору Раманава маюць асаблівую вагу для беларусазнаўства, беларускай філалогіі і літаратуры. Аднак, значная частка архіваў і старадрукаў былога Віленскага беларускага музея і па сенняшні дзень з'яўляецца недастаткова даследаванай і зараз знаходзіцца ў віленскіх бібліятэках і архівах.

4. Дзейнасць першага нацыянальнага беларускага музея ў Вільні пасля арышту дырэктара А. Луцкевіча ў 1939 годзе была прыпынена савецкімі ўладамі. У 1945 г. калекцыі музея былі нераўназначна падзелены паміж літоўскімі і беларускімі навуковымі ўстановамі. Значная колькасць прадметаў беларускага паходжання апынулася ў музеях і навуковых установах Літоўскай Рэспублікі, што цяпер стварае перашкоды для іх усебаковага даследавання беларускімі гісторыкамі і вучонымі. У 2001 годзе ў Вільні Беларускі музей імя Івана Луцкевіча быў адроджаны і распачаўся збор новай музейнай калекцыі.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ І КРЫНІЦ

1. АДАМОВІЧ, Я. Як дух змагання Беларусі (да 100х угодкаў нараджэння І. Луцкевіча). *Беларус*. Нью-Ёрк, 1983, с. 5-27.
2. *Антон Луцкевич: материалы следственного дела НКВД БССР*. Под. ред. В. Н. Михнюка. Минск: БелНИИДАД, 1997.
3. АРЛОЎ, У. *Краіна Беларусь*: ілюстраваная гісторыя. Славакія: друкарня "Neografia", 2003.
4. АРЛОЎ, У.; САГАНОВІЧ, Г. *Дзесяць вякоў беларускай гісторыі*. Мінск: [Б. в.], 1997.
5. БАГДАНОВІЧ, Я. *На жыццёвым шляху*: Успаміны. Мінск: Мастацкая літаратура, 1992.
6. БУДЗЬКА, А. Успаміны пра І. Луцкевіча. *Спадчына*, 1991, № 1, с.18.
7. ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКАЯ, Ю. *Мае ўспаміны*. Вільня: Таварыства беларускай культуры ў Літве, 1994.
8. *Вяртанне:* Дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах пошуку і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі РБ. Мінск: БФК, 1992.
9. *Вяртанне 2*: Зборнік артыкулаў і дакументаў. Мінск: БФК, 1994.
10. *Вяртанне 6: Вяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах*. Пад. рэд. А. Мальдзіса. Мінск: БФК, 1999.
11. *Гадавік Беларускага Навуковага Таварыства*. Вільня: Друкарня Я. Левіна, 1933.
12. *Гісторыя Беларусі канца 18 – пачатку 20 ст. у дакументах і матэрыялах*: Хрэстаматыя. Уклад А. Смаленчука. Вільня: ЕГУ, 2007.
13. ГУЖАЛОЎСКІ, А.А. Сабранае застаецца, калі свой не адхінецца… *Мастацтва Беларусі*, 1991, № 10, с. 67-69.
14. ГУЖАЛОЎСКІ, А.А. *Станаўленне і развіццё музейнай справы Беларусі (1918-1941 гг.)*: Аўтарэферат. Мінск: [Б. в.], 2002.
15. *Запісы Беларускага Навуковага Таварыства*: Сшыток 1. Вільня: Друкарня Я. Левіна, 1938.
16. Інвентарная кніга Музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні. *Спадчына*, 1995, № 1.
17. Інвентарная кніга Музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні. *Спадчына*, 1995, № 2.
18. Інвентарная кніга Музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні. *Спадчына*, 1995, № 3.
19. Інвентарная кніга Музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні. *Спадчына*, 1995, № 4.

20. Інвентарная кніга Музею імя І. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні. *Спадчына*, 1995, № 5.
21. КАЎКА, А. Іван Луцкевіч – адраджэнец. *Беларусіка*. Мінск: Нац. навук. - асветны центр імя Фр. Скарыны, 1993, вып. 1, с. 41-51.
22. КРЫВІЦКІ, Л. Нельга абысці маўчаннем. *Спадчына*, 1991, № 1, с. 10-17.
23. ЛАБАЧЭЎСКАЯ, В. Новыя звесткі пра зборы Беларускага музея імя І. Луцкевіча ў Вільні. *Спадчына*, 1995, № 5.
24. ЛАБЫНЦАЎ, Ю. *Архіў беларускага Адраджэння*. Мінск: [Б. в.], 1993.
25. ЛУЦКЕВІЧ, А. *Беларускі музей ім. Івана Луцкевіча*. Вільня: Друкарня Я. Левіна, 1933.
26. ЛУЦКЕВІЧ, А. *За дваццаць пяць гадоў (1903-1928).* Вільня: Беларускае Выдавецкае Таварыства, 1928.
27. ЛУЦКЕВІЧ, А. *Праблемы культуры, літаратуры і мастацтва*: Выбраныя творы. Мінск: Кнігазбор, 2006.
28. ЛУЦКЕВІЧ, Л.; ВОЙЦІК, Г. *Марыян Пецюкевіч*. Вільня: [Б. в.], 2001.
29. ЛЯХОЎСКІ, У. Спадчына, якая належыць Беларусі. *Спадчына*, 1997, № 6.
30. МІРАНОВІЧ, Я. *Найноўшая гісторыя Беларусі*. Беласток: [Б. в.], 2000.
31. *Памяці І. Луцкевіча. У першыя ўгодкі смерці яго*. Вільня: [Б. в.], 1920.
32. ПЕЦЮКЕВІЧ, М. Успаміны пра Віленскі музей. *Спадчына*, 1995, № 2, с. 77-85.
33. *Пра Івана Луцкевіча*: Успаміны, сведчанні. Укл., прадм., камент., індэкс імёнаў А. Сідарэвіча. Мінск: Кнігазбор, 2007.
34. *Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей: праблемы вяртання і сумеснага выкрыстання:* Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. Мінск. 19-20 чэрвеня 1997 г. Пад рэд. А. Мальдзіса. Мінск: ННАЦ імя Ф.Скарыны, 1997.
35. СІДАРЭВІЧ, А. А. Луцкевіч. *Нёман*, 1990, № 7, с. 92-161.
36. СІДАРЭВІЧ, А. З жыцця А. Луцкевіча. *Літаратура і Мастацтва*, 18 студзеня 1991.
37. СІДАРЭВІЧ, А. Збіральнік і публікатар. Да 120-х угодкаў А.Луцкевіча. *Куфэрак Віленшчыны*, 2004, № 1 (9), с. 114-119.
38. СМАЛЯНЧУК, А. З гісторыі віленскага масонства пачатку ХХ ст. *Спадчына*, 1998, № 5, с. 33-63.
39. СМАЛЯНЧУК, А. Краёвец Антон Луцкевіч. *Гістарычны альманах*, 1998, № 1, с. 27-52.
